Парламенцкі дзённік

# ПАТРАНАЖ З КАМФОРТАМ

## Беларускія заканадаўцы хочуць падключыць бізнэс да сацыяльнага абслугоўвання

**КАМФАРТАБЕЛЬНЫЯ пансіёны, якія хутчэй нагадваюць атэлі, чым дамы састарэлых — ужо даўно не дзіва для Еўропы. Больш за сем гадоў працуюць яны і ў суседняй Расіі, прычым колькасць іх расце ў геаметрычнай прагрэсіі. Канкурэнцыя вялікая, і яны ўсяляк імкнуцца пераўзысці адзін аднаго: кваліфікаваны медперсанал, утульны побыт, шпацыр у хваёвым лесе, цікавы вольны час у кампаніі аднагодкаў. Папулярныя і прыватныя патранажныя службы. Такое можа з'явіцца і ў Беларусі: парламентарыі хочуць мадэрнізаваць заканадаўства, каб падключыць бізнэс да сацыяльнага абслугоўвання. Карыснымі звесткамі насычаліся яны падчас выязнога семінара на сталічных аб'ектах.**



Пенсіянеры, якія жывуць у спецыяльных дамах ды інтэрнатах, атрымліваюць толькі дзясятую частку сваёй пенсіі, астатняе ж ідзе ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Ад **старшыні Мінгарвыканкама Мікалая ЛАДУЦЬКІ** дэпутаты пачулі цікавую прапанову: скіроўваць гэтыя сродкі не на рэспубліканскі ўзровень, а непасрэдна ў тую стацыянарную ўстанову, дзе жыве пенсіянер. Так, натуральна, атрымаецца больш эфектыўна фінансаваць іх утрыманне. Сталічны граданачальнік прапануе таксама развіваць валанцёрскі рух «Пажылыя — старым» (калі немаладыя, але яшчэ досыць бадзёрыя людзі дапамагаюць тым, каму без падтрымкі ўжо не абысціся). Маўляў, без уцягнення людзей сацыяльную працу належным чынам не арганізуеш: на гэтыя клопаты ніякага бюджэту не хопіць.

Ідэі надта актуальныя: на вясновай сесіі, якая пачнецца літаральна праз тыдзень, дэпутаты будуць уносіць папраўкі ў закон аб сацыяльным абслугоўванні.

— Там будзе прадугледжана дзяржаўна-прыватнае партнёрства. Мы плануем туды шырока прыцягваць бізнэс, — кажа **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**.

Пакуль жа дзяржаўна-прыватнае партнёрства ў гэтай галіне, паводле яго ацэнкі, знаходзіцца «ў зародкавым стане». Заканадаўчыя новаўвядзенні, як чакаецца, заахвоцяць дробны ды сярэдні бізнэс да сацыяльнага абслугоўвання, каб «частку праблем наогул зняць з дзяржавы». Дзяржаўны патранаж пры гэтым не зменшыцца: яна ж будзе «аплачваць кошт аказаных паслуг». Бюджэтам на 2011 год, напрыклад, запланавана павелічэнне выдаткаў на сацыяльныя патрэбы на 35 %, і «скарачэння сацыяльных выдаткаў не будзе», запэўнівае спікер.

— Галоўная наша мэта — павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва, — нагадвае кіраўнік ніжняй палаты беларускага парламента. — Асаблівая адказнасць кладзецца на мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, якія непасрэдна працуюць з насельніцтвам, лепш ведаюць іх штодзённыя праблемы і патрэбы.

На яго думку, няма ніводнай сацыяльнай групы, інтарэсы якой не былі б урэгуляваны нацыянальным заканадаўствам. Пенсіянеры, напрыклад.

— Наша пенсійная сістэма адна з самых стабільных [у свеце], — перакананы У. Андрэйчанка. — Так, магчыма, нашы грамадзяне атрымліваюць не такія высокія пенсіі, як хацелася б, але яны адпавядаюць сучаснаму ўзроўню эканамічнага развіцця краіны, выплачваюцца своечасова, пастаянна карэктуюцца з улікам росту сярэдняга заробку.

Летась прынята новая рэдакцыя Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, якой пашыраны паўнамоцтвы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, у тым ліку і па аказанні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі. Аднак гэта не адхіляе далейшай мадэрнізацыі:

— Прыярытэтам нашай заканатворчай дзейнасці з'яўляецца праца па ўдасканаленні Працоўнага кодэкса, законаў аб занятасці насельніцтва і аб сацыяльным абслугоўванні. У планах — распрацоўка прынцыпова новага законапраекта аб абавязковым сацыяльным страхаванні ад беспрацоўя.

### Праца ў вялікім горадзе

Прывабны сацпакет, стварэнне спрыяльных умоў для працоўных і дапамога тым, хто яшчэ не знайшоў сваю вакансію — праблемы занятасці не схаваліся ад удзельнікаў семінару па сацыяльнай абароне.

У сталіцы, дзе даецца кожнае пятае працоўнае месца ў краіне, назіраецца, паводле выразу мэра, «хранічны недахоп людзей па рабочых спецыяльнасцях». Павышаны попыт, напрыклад, на будаўнікоў ды кіроўцаў гарадскога транспарту.

— Беспрацоўе варта разглядаць як структурнае, — лічыць М.Ладуцька. — Людзі не хочуць працаваць на тым месцы, якое ім прапануе біржа працы.

Дапамога па беспрацоўі — 68 тыс. рублёў (23% БПМ). Міжнародная арганізацыя працы рэкамендуе, каб сума падтрымкі складала не менш за 50% ад БПМ. Аднак беларускія ўлады сумняваюцца ў мэтазгоднасці такой шчодрасці.

— Нам вядомы вопыт краін, дзе людзі пакаленнямі не працуюць і спакойна жывуць на дапамогі па беспрацоўі, — кажа мэр. — У нас вунь 17 тысяч вакансій, як жа мы іх запоўнім, калі яшчэ і павысім дапамогу па беспрацоўі?

Закон аб занятасці насельніцтва дэпутаты таксама плануюць змяняць і дапаўняць падчас вясновай сесіі. І паводле прапановы Мінгарвыканкама было б мэтазгодна павысіць памер стыпендый для перанавучання — каб людзі больш ахвотна ішлі на перакваліфікацыю і займалі наяўныя вакансіі.

Дзейсны інструмент кадравай палітыкі, натуральна, — заробкі. Іх павелічэнне, здаецца, у інтарэсах усіх: працаўніку — стымул, прадпрыемству — рабочая сіла, бюджэту — папаўненні і ад падаходнага падатку. Сярэдні заробак сталічнага жыхара, паводле апошніх звестак, складае каля 1,6 млн рублёў. У рэтраспектыве за пяць гадоў заробак мінчан вырас амаль удвая. Надбаўкамі гарадскія ўлады ўтрымлівалі ўрачоў, настаўнікаў, міліцыянераў. Аднак нядаўнія заканадаўчыя змены зрабілі гэта прэрагатывай рэспубліканскага ўзроўню. Мінгарвыканкам прапануе вярнуць іх у распараджэнне сталічных уладаў. Кожнае прадпрыемства вынаходзіць свой ровар. На «Элеме» (на базе якой праходзіў дэпутацкі семінар), напрыклад, актыўна ўкараняюць новае абсталяванне. Яно дапамагае зменшыць патрэбу ў рабочых руках.

Па многіх профілях вакансіі ў сталіцы запаўняюцца выключна за кошт прыезджых, бо мінчане імі грэбуюць. Сталіца штогод прырастае тысяч на 17 мігрантаў. Так, непапулярныя вакансіі часткова запаўняюцца. Аднак з'яўляюцца іншыя праблемы. Напрыклад, няўхільна расце чарга на жыллё, паспявай толькі будаваць...

### Дзве дзясяткі для чаргі

— Аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва павялічыліся ў два разы. Аднак праблемы не вырашылі, — канстатуе сталічны граданачальнік.

Чарга актыўна прырастае ў хвасце, а наперад рухаецца надта марудна. Вось у гарвыканкаме і наспелі прапановы па яе аптымізацыі.

— У Маскве патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў маюць толькі тыя, на каго прападае менш за 6 кв. м плошчы, — спасылаецца на вопыт суседняй сталіцы Мікалай Ладуцька. — У нас ліміт істотна адрозніваецца — менш за 15 кв. м.

У мінскай мэрыі прапануюць, каб на ўлік траплялі толькі тыя, на каго прыпадае менш за 10 кв. м. Лічбу 10 хацелі б бачыць сталічныя ўлады і ў патрабаваннях да прыезджых: каб абавязковай умовай было пражыць у сталіцы як мінімум 10 гадоў (а не пяць, як цяпер), перш чым стаць у чаргу. Інакш вырашыць жыллёвую праблему будзе нерэальна, мяркуе мэр.

Ён таксама перакананы, што гораду патрэбна арэнднае жыллё. Інстытут платнай рэгістрацыі грамадзян, паводле яго назіранняў, вельмі шырока выкарыстоўваецца. Маўляў, калі даводзіцца зносіць жылы дом, колькасць людзей, зарэгістраваных там, «дасягае неразумных межаў».

А вось павышэнне тарыфаў на камунальныя паслугі лічыць абсалютна апраўданым.

— 90% жыллёвага фонду знаходзіцца ў прыватнай уласнасці грамадзян. І што атрымліваецца: з кожным годам мы ўкладваем усё больш і больш бюджэтных сродкаў ва ўтрыманне прыватнага жыллёвага фонду?!

### Праз рэабілітацыю да інтэграцыі

Дэпутаты наведалі рэабілітацыйны цэнтр «Элеас» пры праваслаўнай царкве. Завіталі і ў Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў. Цяпер у малых будзе больш забаў: плазменны тэлевізар, DVD-прайгравальнік, мячы, тэнісныя ракеткі, цікавыя цацкі. Прычым падарункі набытыя не за бюджэтныя грошы, як падкрэсліў спікер Уладзімір Андрэйчанка, а за асабістыя сродкі дэпутатаў і супрацоўнікаў сакратарыята Палаты прадстаўнікоў.

На курс рэабілітацыі сюды прывозяць з усіх куткоў краіны дзетак з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. У кампаніі такіх жа аднагодак яны плаваюць, валяць сімпатычныя цацкі з воўны — карацей, робяць усё, што развівае маторыку. Але самае ўлюбёнае ў іх — гульні з сабакам. Лабрадоры, спецыяльна навучаныя кінолагамі, паказваюць сябе паспяховымі дактарамі. Малыя, якім нялёгка даецца хада, з задавальненнем водзяць махнатых прыяцеляў на павадку. Дзеткі з павышаным тонусам мышцаў рук могуць не зрабіць вялікіх поспехаў у збіранні мазаікі, але ж будуць старанна гладзіць сабаку і надзяваць яму аброжак. Рэабілітацыя ў выкананні чатырохногіх лекараў не толькі фізічная, але і псіхалагічная. Кажуць, што ў хворых дзетак пасля гульні з сабакам з'яўляюцца разняволенасць ды інтарэс да жыцця.

За 10 гадоў існавання цэнтра тут прайшлі рэабілітацыю больш як 9 тыс. дзяцей, у 118 з іх знятая інваліднасць.

З **міністрам працы і сацыяльнай абароны Марыянай ШЧОТКІНАЙ** дэпутаты абмеркавалі, здаецца, усе праблемы галіны. Гучала шмат цікавых прапаноў. Напрыклад, павялічыць пенсіі жанчынам, узнагароджаным Ордэнам маці. І хоць спадарыня міністр перакананая, што «мы не павінны стымуляваць нараджэнне дзяцей за кошт пенсіі, у яе іншая функцыя», яна не выключае, што павысіць яе такім жанчынам можна — праз далучэнне да пераліку пенсій за асаблівыя заслугі. Настойвалі дэпутаты і на тым, каб дапамогі на дзяцей у поўных і няпоўных сем'ях былі аднолькавымі (кажуць, многія эксплуатуюць наяўную розніцу і знарок не заключаюць шлюб). Міністр пагадзілася, але акцэнтавала, што варта не адымаць у сем'яў, а падымаць усіх да аднолькавага ўзроўню. Высокага, хочацца спадзявацца. Выказвалася ідэя рыхтаваць сацыяльных работнікаў у сярэднеспецыяльных навучальных установах — каб, так бы мовіць, павысіць сэрвіс. Каму ж не хочацца камфортнай старасці?! Кваліфікаваны медперсанал, утульны побыт, шпацыр у хваёвым лесе, цікавы вольны час...

**Ала МАЧАЛАВА.**

# «Трэба прымяняць заканадаўства разумна»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Генеральны пракурор нагадаў, што даў даручэнне сваім намеснікам правесці праверку па фактах, якія выкладзены ў заяве экс-кандыдата Міхалевіча (аб катаваннях у СІЗА КДБ).

— Па выніках праверкі мы будзем судзіць, ці былі там парушэнні, — падкрэсліў Рыгор Васілевіч.

Генпракурор таксама паведаміў, што ён паўторна накіраваў ліст старшыні Камітэта дзяржбяспекі, каб права на судовую абарону было рэалізавана для ўсіх асоб, якія знаходзяцца пад следствам па справе аб масавых беспарадках 19 снежня.

Пракаментаваў, па просьбе журналістаў, Генеральны пракурор і факт вынясення афіцыйных папярэджанняў службовым асобам Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Міністэрства прамысловасці.

— Што тычыцца афіцыйных папярэджанняў, вынесеных у адрас намеснікаў кіраўнікоў названых міністэрстваў, — патлумачыў Рыгор Васілевіч, — то гэта не што іншае, як наша жаданне звярнуць увагу на недахопы, звязаныя з павелічэннем колькасці злачынстваў эканамічнага характару ў сістэме гэтых ведамстваў. Мы спадзяёмся, што гэтыя папярэджанні паспрыяюць актывізацыі работы антыкарупцыйных камісій міністэрстваў, будуць стымулам для службовых асоб, каб прааналізаваць, з чым звязана негатыўная тэндэнцыя, што неабходна зрабіць, каб папярэдзіць эканамічныя злачынствы.

Пры гэтым Генпракурор выказаў меркаванне, што пэўны імпульс працы па барацьбе з праявамі карупцыі дасць сумесная калегія з Камітэтам дзяржаўнага кантролю, якая мае адбыцца напрыканцы сакавіка ці ў пачатку красавіка.

Паводле слоў Генпракурора, у 2010 годзе зарэгістравана больш як 14 тысяч крадзяжоў з аўтамабіляў, пакінутых іх гаспадарамі на ўнутрыдваравых тэрыторыях ці ў іншых месцах, якія не ахоўваюцца. Большасць такіх злачынстваў здзейснена ў Мінску. Гэты від злачыннасці звязаны ў першую чаргу з недахопам ахоўных аўтастаянак. Так, у рэспубліцы зарэгістравана каля 3 млн адзінак індывідуальнага аўтатранспарту, а месцаў у гаражных кааператывах — 430 тысяч, машынамесцаў на ахоўных аўтастаянках — 164 тысячы.

Летась тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў у выканаўчыя і распарадчыя органы накіраваны 192 лісты па пытанні адкрыцця аўтастаянак. Па выніках іх разгляду абсталявана ўсяго толькі 17... Стаянкі, як адзначыў Рыгор Васілевіч, у першую чаргу клопат мясцовых уладаў. А ў іх працы пакуль што яшчэ вельмі шмат фармалізму.

— Знаёмішся з некаторымі рашэннямі — і бачна, што абмяжоўваюцца проста агульнымі заклікамі «актывізаваць», «узмацніць». Гэтага мала. Даўно дадзена даручэнне аналізаваць сітуацыю і, зыходзячы з гэтага, выпрацоўваць канкрэтныя меры.

**Надзея ДРЫЛА.**

# «НЕЛЬГА ІСЦІ ШЛЯХАМ ПРЫЦЯГНЕННЯ Ў ВНУ ЎСІХ АХВОТНЫХ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аднак у бягучым годзе план набору ў ВНУ Міністэрства адукацыі ўсё ж такі не зменіцца. Адбудзецца толькі пераразмеркаванне лічбаў набору: у чарговы раз будзе скарочаны прыём на эканамічныя, юрыдычныя і некаторыя педагагічныя спецыяльнасці і павялічаны набор на інжынерна-тэхнічныя спецыяльнасці і спецыяльнасці для ІТ-галіны. Зменшыцца набор у ВНУ «сілавых» ведамстваў і Міністэрства аховы здароўя.

Між іншым, Сяргей Маскевіч агучыў адну цікавую лічбу: па выніках апошняй зімовай сесіі з ВНУ было адлічана каля 7 тысяч студэнтаў. У адным толькі Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце такіх гора-студэнтаў, якія не здолелі справіцца з вучэбнай праграмай, набралася каля 700 чалавек. «Ільвіную» долю сярод адлічаных складаюць першакурснікі. «Усе гэтыя маладыя людзі вельмі халатна аднесліся да свайго паступлення ў ВНУ і не вытрымалі першых іспытаў, — падкрэсліў міністр. — Натуральна, нас хвалюе іх далейшы лёс. Нельга, каб яны заставаліся на вуліцы. Напэўна, трэба ўносіць пэўныя карэктывы ў парадак прыёму ў прафесійна-тэхнічныя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, каб тыя, хто быў адлічаны з ВНУ, маглі ў іх паступіць і атрымаць прафесію, якая зможа іх пракарміць, а ўжо затым, маючы рабочую спецыяльнасць, зноў паступаць у ВНУ, калі, вядома, будзе у гэтым патрэба...»

Адной з важнейшых задач, ад рашэння якой у немалой ступені будзе залежаць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, з'яўляецца абнаўленне вучэбна-лабараторнага абсталявання ў адпаведнасці з патрэбамі сучасных вытворчых тэхналогій, знос якіх у дзяржаўных ВНУ дасягае 70 працэнтаў. Трэба забяспечыць ВНУ вучэбна-лабараторнымі плошчамі, дастатковымі для арганізацыі якаснага адукацыйнага працэсу. У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай будуць узведзены 43 вучэбна-лабараторныя карпусы і пабудовы. Таксама ў бліжэйшую пяцігодку запланавана пабудаваць і 27 студэнцкіх інтэрнатаў, разлічаных больш чым на 22 279 месцаў. На сёння забяспечанасць іншагародніх студэнтаў месцамі ў інтэрнатах вагаецца ў розных ВНУ ад 40 да 80 працэнтаў. Паводле слоў міністра, у будучым навучальным годзе ў новыя інтэрнаты ў студэнцкай вёсцы змогуць засяліцца студэнты Беларускага дзяржаўнага педагагічнага і медыцынскага ўніверсітэтаў. Аднак і будаўніцтва студэнцкай вёскі не зможа цалкам забяспечыць усіх студэнтаў мінскіх ВНУ дахам над галавой.

— Перад намі ставіцца канкрэтная задача — павялічыць экспарт адукацыйных паслуг у тры разы і давесці даходы ад яго да 186 млн 68 тысяч долараў ЗША. Колькасць студэнтаў-замежнікаў павінна да 2015 года павялічыцца да 15 тысяч чалавек. Таму пытанне будаўніцтва інтэрнатаў для студэнтаў мае выключнае значэнне. Без яго вырашэння мы развіваць экспарт адукацыйных паслуг проста не зможам, — падкрэсліў міністр.

Адказваючы на пытанне журналіста «Звязды» аб увядзенні на другой ступені вышэйшай адукацыі практыка-арыентаванай магістратуры, Сяргей Маскевіч паведаміў наступнае:

— Мы спадзяёмся, што практыка-арыентаваная магістратура адкрые новыя магчымасці як для маладых людзей, якія змогуць такім чынам павысіць свой адукацыйны ўзровень, так і для заказчыкаў, у якіх з'явяцца новыя магчымасці для вырашэння сваіх кадравых праблем. Фактычна размова ідзе пра магістратуру з паглыбленай падрыхтоўкай спецыяліста. Яна будзе разлічана на людзей, якія маюць схільнасці да творчай і аналітычнай работы.

Адукацыйны працэс у магістратуры будзе арыентавацца на падрыхтоўку спецыялістаў па прыярытэтных напрамках навукова-тэхнічнай дзейнасці і іншай дзейнасці інавацыйнага характару. Гэта будуць спецыяльнасці, звязаныя з менеджментам і адміністраваннем, а выпускнікі магістратуры будуць атрымліваць дыпломы «магістраў інавацый», «магістраў кіравання», «магістраў турызму», «магістраў гасціннасці» (размова ў гэтым выпадку ідзе пра інавацыйны менеджмент у сферы турызму і ў сферы гасціннасці) і г.д. Праўда, пакуль не вырашана, ці будуць матэрыяльна заахвочвацца дадатковыя веды, атрыманыя выпускнікамі магістратуры.

— Магчыма, спачатку мы будзем толькі рэкамендаваць наймальнікам матэрыяльна стымуляваць такіх работнікаў, паколькі ніхто з працадаўцаў не мае ніякага ўяўлення аб практыка-арыентаванай магістратуры. У чым заключаецца паглыбленая падрыхтоўка спецыяліста? Якія перавагі ўладальнік дыплома магістра інавацый мае перад выпускнікамі першай ступені вышэйшай адукацыі? Усё гэта ім яшчэ трэба будзе ацаніць. А далей пабачым...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «ЛЕПШАЯ ПАШТОВАЯ МАРКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 2010 ГОДА»

**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства паштовай сувязі «Белпошта» паведамляе, што з 14 лютага па 14 сакавіка 2011 года праводзіўся конкурс «Лепшая паштовая марка Рэспублікі Беларусь 2010 года».**

Усяго атрымана 1534 анкеты аб лепшай паштовай марцы 2010 года. Па выніках конкурсу вызначаны лепшы паштовы выпуск Рэспублікі Беларусь 2010 года. Ім стаў паштовы блок «Прызёры Гульняў XXIX Алімпіяды ў Пекіне». Мастацкае афармленне паштовага блока — Аляксей Нікалаеўскі. Другое месца — блок «Мірскі замак» (233 галасы), трэцяе — блок «65-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне» (170 галасоў). РУП «Белпошта» дзякуе ўсім за ўдзел у апытанні і за прапановы, выказаныя ў анкетах. Згодна з умовамі конкурсу, удзельнікі апытання, якія даслалі лісты з правільна запоўненай анкетай і назвалі марку-пераможцу, будуць узнагароджаны адным гадавым абанементам на паштовыя маркі Рэспублікі Беларусь, 10 тэматычнымі камплектамі паштовых марак і 200 наборамі філатэлістычнай прадукцыі.

**Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне саветніку-кансультанту аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве БЕРАЗОЎСКАЙ Юліі Ігараўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

## Абзац

◢ **Дзяржаўтаінспекцыя правядзе 25 сакавіка Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху пад дэвізам «Цвярозасць — норма жыцця!»**

◢ Аўтамабільны кран перакуліўся 22 сакавіка пры правядзенні будаўнічых работ пры рэканструкцыі гімназіі №16, што на вуліцы Лесі Украінкі ў Мінску. Выпадак здарыўся ў 16:25. Кран зваліўся на плот дзіцячага садка і альтанку. Машына перакулілася падчас перамяшчэння бетонных блокаў вагой каля 2 т. На шчасце, у інцыдэнце ніхто не пацярпеў.

◢ **Продаж гарэлкі ў Беларусі ў студзені-лютым г.г. у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырас на 2,6%. У абсалютным алкаголі рэалізавана 1503,2 тыс. дал алкагольных напояў і піва, што складае 110% да аналагічнага перыяду 2010 года. Пры гэтым рэалізацыя каньяку (у т.л. каньячныя напоі і брэндзі) вырасла на 41,7% (57,1 тыс. дал), лікёра-гарэлачных вырабаў — на 40,6% (313,2 тыс. дал). На чвэрць вырас продаж ігрыстых вінаў, уключаючы шампанскае, на столькі ж — піва. Больш прададзена вінаграднага (481,1 тыс. дал) і пладовага віна (2442 тыс. дал), а слабаалкагольных напояў рэалізавана за гэты перыяд на 22,8% менш.**

## Поўны абзац

◢ Узбекскія даішнікі не пазналі міністра ўнутраных спраў краіны і спагналі з яго хабар. Інцыдэнт адбыўся па дарозе з Ташкента ў Самарканд. Міністр ехаў у прыватным аўтамабілі з асабістым кіроўцам, калі аўтаінспектары спынілі яго за перавышэнне хуткасці. Спрабуючы ўрэгуляваць канфлікт, кіроўца прапанаваў інспектарам хабар у памеры 5000 сумаў (каля 3 долараў). Вартавыя парадку на дарогах згадзіліся прыняць грошы, не заўважыўшы, што ў аўтамабілі знаходзіцца міністр МУС Узбекістана ў цывільнай вопратцы. У выніку кур'ёзнага інцыдэнту пасадаў пазбавіліся два інспектары паставой службы, тры начальнікі аддзелаў ДПС, а таксама намеснік кіраўніка абласнога УУС.



◢ **Тоўстаму аўстралійскаму парасяці па мянушцы Барыс зробяць аперацыю па падцяжцы скуры. Працэдуру правядзе ветэрынар. Неабходнасць у ёй узнікла ў сувязі з тым, што лішні тлушч на лбе занадна моцна навісае над вачыма жывёліны, і таму яна пачала дрэнна бачыць. Больш за тое, калі Барыс худзее, складкі скуры яшчэ мацней закрываюць яму вочы. У выніку гаспадары вырашылі адправіць свайго гадаванца на аперацыю. Барыса яны купілі 3 гады таму. Прадавец запэўніў іх, што свінчо застанецца невялікім на ўсё жыццё — будзе важыць не больш за 60 кг. Аднак зараз Барыс важыць 250 кг. Нягледзячы на габарыты, сям'я трымае яго ў сваёй кватэры. Барыс спіць на спецыяльным матрацы ў спальні сваіх гаспадароў. У сне ён праводзіць да 16 гадзін, астатні час гуляе ў садзе і есць садавіну і агародніну, а таксама блінцы.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
__________А.Л.Гальперин
17 марта 2011 г.

**УТВЕРЖДЕНО**
Общим собранием Участников
КСО «Внешэкономстрой» ООО
24 февраля 2011 года
(протокол № 12)

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже жилищных облигаций двадцать четвертого выпуска Коммерческой совместной организации «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (КСО «Внешэкономстрой» ООО)

**Раздел 1. Общие сведения об эмитенте**

**1. Наименование эмитента.**

На белорусском языке:

полное наименование: Камерцыйная сумесная арганізацыя «Знешэканомбуд» таварыства з абмежаванай адказнасцю;

сокращенное наименование: КСА «Знешэканомбуд» ТАА.

На русском языке:

полное наименование: Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (далее по тексту – эмитент);

сокращенное наименование: КСО «Внешэкономстрой» ООО.

**2. Место нахождения эмитента:** 220004, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А; **телефон**: (017) 218 15 56; **факс**: (017) 218 15 55; **электронный адрес** (e-mail): market@vnesheconomstroy.by.

**3. Основной вид деятельности эмитента:**

согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006

701 – Операции с собственным недвижимым имуществом.

Эмитент вправе осуществлять функции заказчика (застройщика) согласно «Инструкции о застройщике, заказчике в строительстве», утвержденной приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь 22 июня 1999 г. № 174 (с учетом изменений в действующей редакции).

**4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка:** р/с № 3012004529008 в ОАО «Белвнешэкономбанк», г. Минск, ул. Мясникова, 32, код 226.

**5. Бухгалтерская отчетность** эмитента в составе, определенном пунктом 9 Инструкции о порядке представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг, утвержденной постановлением Комитета по ценным бумагам при Совете Министров Республики Беларусь от 16 декабря 2005 г. № 10/П «О некоторых вопросах представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг», в соответствии с законодательством в периодическом печатном издании не публиковалась и ее опубликование не требуется.

**6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**: Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк» (далее по тексту – депозитарий).

**Место нахождения депозитария:** Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, ком. 607. Зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 12 декабря 1991 года, регистрационный номер 24.

Специальное разрешение (**лицензия**) № 02200/0247744 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выдано (продлена) Министерством финансов Республики Беларусь депозитарию на основании решения от 13 июля 2007 года № 243 сроком на 5 лет и действительна до 29 июля 2012 года.

**7. Размер уставного фонда эмитента:** 1 197 275 (Один миллион сто девяносто семь тысяч двести семьдесят пять) долларов США (уставный фонд сформирован в размере 100 %).

**8. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование органа, его зарегистрировавшего.**

Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь 15 августа 2002 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800015707.

**9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.**

Ознакомиться с Проспектом эмиссии облигаций можно ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 15.00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9.00 до 12.30) начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:

- в КСО «Внешэкономстрой» ООО по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А;

- в ОАО «Белвнешэкономбанк» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

**10. Решение о выпуске жилищных облигаций двадцать четвертого выпуска** принято 24.02.2011 года на внеочередном Общем собрании Участников (**протокол № 12**).

**11. Объем эмиссии жилищных облигаций составляет:**

**двадцать четвертого** выпуска – 1 885 669 000 (Один миллиард восемьсот восемьдесят пять миллионов шестьсот шестьдесят девять тысяч) белорусских рублей;

**Количество** жилищных облигаций:

**двадцать четвертого** выпуска – 233 (Двести тридцать три) штуки;

**12. Номинальная стоимость одной жилищной облигации:**

**двадцать четвертого** выпуска – 8 093 000 (Восемь миллионов девяносто три тысячи) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира № 336, 24 этаж, 3-я секция в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);

**13. Открытая продажа (размещение)** жилищных облигаций проводится **с 30 марта 2011 года и по 23 марта 2012 года**.

**14. Срок обращения облигаций с 30 марта 2011 года по 31 марта 2012 года включительно (368 календарных дней).**

**15. Проведение открытой продажи (размещения)** жилищных облигаций осуществляется ОАО «Белвнешэкономбанк» ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 15.00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9.00 до 12.30) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

**16. Облигации зарегистрированы** Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 17.03.2011 года.

Регистрационный номер: № 5-200-02-1035.

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
❖ Независимая строительная экспертиза

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОДО «АРНИУС-М»

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Адрес объектов продажи | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Незавершенное законсервированное капитальное строение – здание многоквартирного жилого дома, железобетонное ограждение | Общая площадь строения – 1601,9 кв.м. Стены и перегородки кирпичные, перекрытия – железобетонные плиты. Процент готовности строения – 26%. Незавершенное капитальное строение расположено на земельном участке площадью 0,7058 га. Площадь ограждения – 668 кв.м. | г. Гомель, м-н Мельников луг | 870 588 500 | 43 529 425 |
| **Продавец имущества**: Управляющий в деле о банкротстве ОДО «Арниус-М». Шаг торгов – 9%. Вознаграждение – 5% от цены продажи лота | | | | | |
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 11 апреля 2011 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а | | | | |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **12 апреля 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» | | | | |
| **Номер р/с для перечисления залога** | Р/с 3012105618010 Региональная Дирекция № 700 ОАО «БПС-БАНК», БИК 153001369, УНП 100219673 | | | | |
| **Условие продажи** | Без условий. Цены указаны без НДС. | | | | |
| Подробная информация о перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» № 127 от 02.07.2010 г. | | | | | |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность. | | | | |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87, 77 52 78 (факс).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### по продаже земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов

### Организатор аукциона — Крошинский сельский исполнительный комитет Барановичского района

| № п/п | Местоположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка | Характеристика инженерных коммуникаций | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | Площадь земельного участка (га) | Назначение участка | Начальная цена объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, Крошинский с/с, д. Дубровно, ул. Заречная, д. 24 а. Кадастровый номер 120483002101000038 | | | 0,23 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2503044 | 250300 | 938470, кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона |

Аукцион состоится **27 апреля 2011 года в 14.30** в здании Крошинского сельского Совета и по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Крошинский сельский Совет, агрогородок Крошин.

**Условия аукциона:**

1. Наличие не менее двух участников.

2. Приступить к строительству жилого дома не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на земельный участок.

3. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории РБ или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 15%.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;

- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;

- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется **до 22 апреля 2011 г. до 17.00** на расчетный счет 3604211080006 филиал 802 ОАО АСБ «Беларусбанк», код 245 (г. Барановичи, Б. Штокерау, 8а).

Получатель УНП 200046981 Крошинский сельский Совет депутатов, 225362, Брестская обл., Барановичский р-н, агрогородок Крошин.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену.

Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Победитель аукциона обязан:

- оплатить в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона по оформлению и государственной регистрации создания земельных участков, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссию по телефонам (8 0163) 43 72 36, 43 72 35.

9. Продажа земельного участка производится без изменения его целевого назначения.

10. Покупатель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка с наибольшей стоимостью.

11. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни **с 27 марта по 22 апреля 2011 года в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** (каб. 1 сельисполкома).

Последний день приема документов **22 апреля 2011 года до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона — **27 апреля 2011 года с 13.00 до 14.00.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона: не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на проведение аукциона; произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

24 сакавіка 2011 г.
№ 11 (249)

**ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»**

# Адзінкавы выпадак — яшчэ не сістэма

**Два тыдні таму ў рэдакцыю звярнуліся пасажыры міжгародняга рэйса «Мінск — курортны пасёлак Нарач» (адпраўленне з аўтавакзала «Маскоўскі») са скаргай на відавочнае парушэнне раскладу руху — 1 сакавіка іх рэйс быў затрыманы на паўгадзіны («МС» за 10.03. г.г.).**

Рэдакцыя атрымала аператыўнае рэагаванне, падпісанае в.а. генеральнага дырэктара ААТ «Мінаблаўтатранс» Н. ШЫБКОЎСКАЙ.

*«Артыкул «Ваш рэйс затрымліваецца...» разгледжаны ААТ «Мінаблаўтатранс»...*

*Дырэктар філіяла «Аўтамабільны парк № 7» ААТ «Мінаблаўтатранс» Грышчук К.М. за нездавальняючы кантроль за арганізацыяй перавозачнага працэсу зараз вызвалены ад пасады.*

*Невыкананне рэйса па маршруце «Мінск—Нарач», дапушчанае 01.03.2011 г., з'яўляецца адзінкавым выпадкам, а не сістэмай. Так, у лютым 2011 г. філіял выканаў 100% планавай колькасці рэйсаў, у студзені — 99,5%.*

*Праца філіяла «АП № 7» кіраўніцтвам ААТ «Мінаблаўтатранс» узята на асаблівы кантроль. Спадзяёмся, што гэты выпадак не паслужыць падставай для фарміравання агульнай негатыўнай ацэнкі ўсёй працы ААТ «Мінаблаўтатранс».*





Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# НЮАНСЫ «ГОРАДА МАРЫ»

**Па колькасці жыхароў Фаніпаль адносіцца да катэгорыі малых гарадоў, аднак у многіх дачыненнях гэта адметны, не падобны на астатнія, населены пункт, і жыхары іншых малых гарадоў могуць толькі пазайздросціць фаніпальцам.**

Напрыклад, на пачатак года ў Фаніпалі было 7800 працоўных месцаў, створаных юрыдычнымі асобамі ўсіх форм уласнасці, а эканамічна актыўнага насельніцтва тут зарэгістравана ўсяго 7200. Рэч у тым, што толькі 30-40 працэнтаў жыхароў горада працуюць па месцы прапіскі. Большасць жа працаўладкавалася па-за межамі Фаніпаля, у асноўным, у Мінску. Затое ў самім Фаніпалі працуе шмат мінчан. Дастаткова пабачыць, колькі народу прыязджае сюды на ранішніх электрычках.

Фаніпаль сёння — фактычна прыгарад сталіцы. Ён размешчаны ўсяго за 17 км ад МКАД. Электрычка са сталіцы ідзе сюды 33 хвіліны. Маршруткі, якія курсіруюць паміж двума гарадамі літаральна праз кожныя 20 хвілін, «дабягаюць» яшчэ хутчэй (калі не патрапяць у сталічны затор). Апроч таго, шэраг прадпрыемстваў, размешчаных у Фаніпалі, ажыццяўляе падвоз сваіх работнікаў уласным транспартам (у тым ліку і з самога Мінска). Зразумела, што больш аддаленым гарадам, нават тым, што маюць статус райцэнтра, значна цяжэй вырашыць у сябе праблему беспрацоўя.

Сам Фаніпаль першапачаткова будаваўся як прамысловы горад. Дастаткова ўзгадаць вядомы кожнаму жыхару рэспублікі ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі», вытворчы гігант РУП «Дарбудіндустрыя» (куды ўваходзіць некалькі магутных заводаў, у тым ліку і філіял завода жалезабетонных маставых канструкцый), РУП «Беларуснафта-Мінскаблнафтапрадукт» і іншыя. Сёння ў Фаніпалі выпрабляюцца самыя розныя тавары — ад касметыкі да элементаў авіяцыйнай тэхнікі. Сярэдні заробак на прадпрыемствах і арганізацыях горада летась склаў больш за 1,5 млн рублёў. Красамоўны прыклад: адно мясцовае прадпрыемства шукала сабе бляхара, якому прапаноўвала заробак ад 2,5 млн рублёў. Аб'ява ў раённай газеце друкавалася на працягу года. І не таму, што не знаходзілася спецыялістаў адпаведнага профілю. Людзей не задавальнялі ўмовы працы і... памер заробку. Па гэтым паказчыку Фаніпаль набліжаецца да сталіцы.

Па выніках перапісу 2009 года ў горадзе пражывала 12706 чалавек. Аднак, як патлумачыў **старшыня Фаніпальскага гарадскога Савета дэпутатаў Сяргей КОЛАС**, рэальная лічба на 3-5 тысяч больш. Менавіта столькі тут незарэгістраваных, а значыць, і не ўлічаных грамадзян. За мінулы год прырост колькасці жыхароў склаў у Фаніпалі 175 чалавек (як за кошт нованароджаных, так і дзякуючы перасяленцам з іншых рэгіёнаў, якія пераехалі сюды на ПМЖ). Унушае аптымізм мясцовая статыстыка нараджальнасці: за першую пяцігодку XXI стагоддзя сярэдняя нараджальнасць склала 116 дзетак, за другую пяцігодку — 131. У 2009-м на свет з'явілася 148 немаўлят. Летась — 134.

...У Фаніпалі актыўна ўзводзіцца жыллё. На рознай ступені будаўніцтва (ад праектавання да аддзелачных работ) знаходзіцца з дзясятак жылых дамоў — а гэта прыкладна тысяча новых кватэр. Сёння ў горадзе маюць шанц палепшыць жыллёвыя ўмовы тыя, хто стаў на чаргу ў 2008 годзе. Пры жаданні чаргавікі могуць атрымаць участак пад індывідуальную забудову.

Здавалася б, не горад, а мара: і працаваць ёсць дзе, і заробак высокі, і жыллёвае пытанне аператыўна вырашаецца, і дэмаграфічная сітуацыя радуе, ды і сталіца — побач. Аднак, як гаворыцца, ёсць нюансы.

## Эканомія і творчы падыход

...Па колькасным параметры Фаніпаль падпадае пад азначэнне «малы горад». Аднак дзяржпраграма развіцця малых і сярэдніх гарадоў у дачыненні да яго не вельмі дзейсная. Як памятаем, галоўны ўпор у праграме робіцца на стварэнні новых працоўных месцаў. А для Фаніпаля, як вынікае з вышэйсказанага, гэта неактуальна. Вядома ж, тут, як і ўсюды, наглядаецца недахоп адных спецыялістаў і лішак іншых. Але дзякуючы блізкасці сталіцы людзі самастойна (і паспяхова) вырашаюць пытанне працаўладкавання. Новыя прадпрыемствы і арганізацыі ўтвараюцца ледзь не кожны год, але значная частка работнікаў — прыезджыя, у асноўным мінчане.

Фаніпаль — адзін з 13 гарадоў раённага падпарадкавання на тэрыторыі нашай краіны. Адпаведна, большая частка падаткаў, якія плацяць шматкольквасныя прадпрыемствы і арганізацыі горада, мінаючы гарадскі бюджэт, напрамую накіроўваюцца ў раённы ці нават адразу ў рэспубліканскі бюджэт (у залежнасці ад формы падпарадкавання юрыдычнай асобы).

Расходныя артыкулы гарадскога бюджэту абмяжоўваюцца толькі пагашэннем затрат на ўтрыманне будынка і штату самога гарвыканкама (камунальныя плацяжы і заробак супрацоўнікаў). На гэта якраз і хапае даходаў, якія горад атрымлівае ад збору зямельнага падатку і падатку на нерухомасць з фізічных асоб, а таксама невялікай долі падаходнага падатку, дзякуючы якому бюджэт горада перастаў быць датацыйным. Іншых крыніц даходу, прапісаных ва Указе №21, у горада няма.

Акрамя таго, у адрозненне ад бюджэтаў сельскіх і пасялковых выканкамаў, якія таксама з'яўляюцца бюджэтамі пярвічнага ўзроўню, у бюджэце Фаніпаля не прадугледжана асобнага расходнага артыкула — на добраўпарадкаванне. Гэтыя функцыі цалкам ускладзены на мясцовую службу ЖКГ, якая падпарадкоўваецца райвыканкаму і атрымлівае грошы на вышэйназваныя работы з раённага ж бюджэту. З улікам таго, што першачарговая задача жыллёва-камунальнай службы — забеспячэнне нармальнай эксплуатацыі жылога фонду, што абслугоўвае яна не толькі горад, але і бліжэйшыя вёскі, а таксама з улікам абмежаванасці яе штату і фінансаў, становіцца зразумелым, што дадатковыя рэзервы, скіраваныя на добраўпарадкаванне, гораду не пашкодзілі б. Дастаткова адзін раз праехацца па Фаніпалі, каб у гэтым пераканацца.

Асаблівай увагі патрабуюць дваровыя тэрыторыі. Гэта і асфальтаванне, і ўстаноўка дзіцячых абсталяваных гульнявых пляцовак, і арганізацыя паркоўвачных месцаў. Ямачны рамонт дваровых тэрыторый праводзіцца, але сёння гэтага недастаткова, адзначыў старшыня гарсавета. У Дзяржынскім раёне зацверджана праграма добраўпарадкавання дваровых тэрыторый Фаніпаля на 2011-2015 гады. Будзем спадзявацца, што ўсе прадугледжаныя ў ёй мерапрыемствы будуць рэалізаваны.

Актуальным застаецца пытанне цеплавой мадэрнізацыі старога жыллёвага фонду. У горадзе шмат «ваенных» дамоў, якія раней з'яўляліся ведамаснымі, а потым былі перададзены на баланс ЖКГ (прычым далёка не ў ідэальным стане).

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ**

# У чым праблема?

**У рэдакцыю прыйшоў ліст ад жыхароў вёскі Лейцішкі Навадворскага сельсавета Шчучынскага раёна, дзе паведамлялася, што «з часоў развалу Саюза» саўгас «Навадворскі» не апрацоўвае землі, якія знаходзяцца каля названай вёскі і вёсак Саснабор і Прыбыткоўшчына. «Гэта прыкладна 150 га ворнай зямлі, якая пачынае зарастаць. А раней на ёй вырошчвалі буракі, кукурузу і іншыя культуры, — паведамляецца ў лісце. — А яшчэ каля нашых вёсак суцэльныя сенакосы (каля 200 га), якія шмат гадоў ніхто не ўбірае. Мясцовыя жыхары хвалююцца: калі хто-небудзь падпаліць траву, можа згарэць уся вёска!»**

— З такой пастаноўкай пытання я не згодны, — абурыўся **дырэктар саўгаса «Навадворскі» Ян ПАЎЛЮКЕВІЧ**, якому я датэлефанавалася па мабільным (для сельгаспрадпрыемстваў пачынаецца вясновая пара, таму кіраўнікі ў кабінетах не заседжваюцца). — Сенакосы мы ўбіралі ўвесь час — хоць бы таму, што нам трэба карміць грамадскі статак, а гэта 1,5 тысячы галоў буйной рагатай жывёлы. Выключэнне складае ўрочышча памерам у 36 га, куды мы не здолелі летась увайсці з-за высокай забалочанасці. Там нізіна, і ў ёй цэлы год стаяла вада, бо практычна праз дзень ішлі дажджы.

На сваёй пасадзе Ян Паўлюкевіч працуе другі год, але сцвярджае, што і раней неаднойчы складваліся падобныя сітуацыі: тэхніка на нізінны ўчастак заходзіла не заўсёды.

— Часам было, што і зойдуць туды, і нават пакосяць, а вывезці скошанае не атрымліваецца, не могуць даць рады — такое забалочанае поле... Я ў мінулым годзе вырашыў ужо яго заараць — пад кукурузу ці іншую культуру, але мы не здолелі гэта зрабіць, тэхніка літаральна вязла, — тлумачыць Ян Паўлюкевіч. — Па вялікім рахунку, там патрэбна меліярацыя, але ж мы вымушаны зыходзіць з сённяшніх рэалій.

Паводле слоў дырэктара саўгаса, «спадчына» (у сэнсе, гаспадарка) яму дасталася, мякка кажучы, праблемная.

— У нас 1,5 года няма галоўнага заатэхніка, няма селекцыянера, год няма ветурача, не хапае механізатараў... За два гады працы ў мяне было ўсяго пяць выхадных дзён, пра водпуск я ўжо і не ўспамінаю. Сёння ў сельскай гаспадарцы сітуацыя такая, што механізатара знайсці прасцей, чым спецыяліста. Няма адкуль браць спецыялістаў — пры тым, што іх, здавалася б, рыхтуюць і ў ВНУ, і ў іншых навучальных установах. Але падлічыце, колькі з іх сапраўды даязджае да вёскі (з той жа Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі) і колькі ў вёсцы застаецца. Мізэр! Атрымаўшы «корачку», выпускнікі ВНУ праўдамі і няпраўдамі адбіваюцца ад працы на сельгаспрадпрыемствах. А калі і трапляюць да нас па размеркаванні, дык лічаць дні — як у арміі да «дэмбелю»... Калі ў бліжэйшыя 2—3 гады ў галіне сельскага гаспадарання нічога істотна не зменіцца, галоўных спецыялістаў мы будзем шукаць са свечкай, і ў першую чаргу заатэхнікаў. Ужо і будаўніцтва жылля не дапамагае. «Домікі» ёсць, будуюцца яшчэ некалькі, але хутка іх не будзе каму даваць.

Калісьці ў саўгасе «Навадворскі», па словах Яна Паўлюкевіча, працавала 960 чалавек. Гэта была моцная гаспадарка, якая спецыялізавалася на вырошчванні гародніны. Сёння тут засталося 180 работнікаў, з пэўнай часткай якіх можна было б са спакойным сэрцам развітацца — калі б было кім іх замяніць.

— Яшчэ ў 80-х людзі былі іншымі — за работнікам не трэба было стаяць ці хадзіць, яму пэўны від працы прапанаваў — і ўсё, можна спадзявацца на вынік. Сёння такая адказнасць сустракаецца рэдка, — уздыхае Ян Эдвардавіч.

Магчыма, сітуацыя зменіцца ў лепшы бок пасля таго, як саўгас «Навадворскі» будзе далучаны да ААТ «Гроднажылбуд»? Далучэнне павінна адбыцца ў хуткім часе, па самых аптымістычных прагнозах, ужо ў красавіку.

— У чымсьці саўгас, зразумела, ад гэтага выйграе — напэўна, лягчэй будзе і паліва набываць, і тэхніку купляць... Але ж ніхто з Гродна не паедзе працаваць да мяне на ферму, не перакваліфікуецца ў трактарысты. Кадры — вось галоўная праблема, і яна застанецца.

— У гэтым сэнсе вы настроены не вельмі аптымістычна? — удакладняю ў Яна Эдвардавіча.

— Раней я заўсёды быў аптымістам, — адказвае ён. — Але пасля таго, як папрацаваў дырэктарам саўгаса з зарплатай 1 360 тыс. рублёў на рукі, аптымізм скончыўся.

Размова з кіраўніком мясцовай улады — **старшынёй Навадворскага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандрам ХВАСЬКО** — адбывалася крыху ў іншым рэчышчы. Пацвердзіўшы, што на вышэйназваных 36 гектарах зямельных угоддзяў браць сена сапраўды можна было толькі ў сухі год, Аляксандр Яўгенавіч перайшоў да тэмы пажараў, якія (на думку аўтараў ліста ў рэдакцыю) могуць узнікнуць у любы момант ад узгарання сенакосу.

— На мой погляд, сёння большую небяспеку ўяўляюць не сенакосы. Поле з травой можна ўзараць па перыметры — прычапіць да трактара пяцікорпусны плуг і адзін раз прайсціся вакол. І ніякае полымя — нават пры ўмове яго ўзнікнення — нікуды з поля не перакінецца. Так мы, у прынцыпе, дзейнічалі ў засушлівыя гады, калі ўзнікала пагроза ўзгарання лясоў, — кажа Аляксандр Хвасько. — Але мяне ў першую чаргу хвалюе іншае — кінутыя, безгаспадарныя дамы і ўчасткі каля іх, якія сапраўды зарастаюць травой і становяцца відавочнай пагрозай для вёскі.

Кінутых дамоў на тэрыторыі сельсавета шмат — каля 350. Калі ёсць спадчыннікі, мясцовая ўлада спрабуе іх адшукаць, у тым ліку пры дапамозе тутэйшых жыхароў. Калі ж спадчыннікі не адклікаюцца, то ў адпаведнасці з Указам № 70, дом, які пусцее, па рашэнні суда можа перайсці ў камунальную ўласнасць.

— Але працэдура гэта вельмі цяжкая, працяглая і марудная. Пакуль што нам удалося адсудзіць толькі два такія дамы, — кажа Аляксандр Хвасько. — У вёсцы Лейцішкі, напрыклад, жыве ўсяго 9 чалавек, а дамоў налічваецца аж 27. Натуральна, там ёсць вялікая спакуса для бамжоў — у кінутых дамах яны начуюць, жывуць, п'юць, кураць... Змагаемся з імі ўсімі магчымымі метадамі, падключаем міліцыю, участковага, але ж на ўсе выпадкі не падстрахуешся. Гэта больш небяспечная сітуацыя, чым наяўнасць сенакосу непадалёку ад вёскі.

Аднак Аляксандр Хвасько паабяцаў, што тую зону, пра якую ішла гаворка ў лісце вяскоўцаў, возьме на кантроль, а сенакосы будуць абавязкова пераараныя па перыметры — у мэтах перасцярогі.

— Няхай толькі спачатку зямля крыху падсохне, каб трактар з плугам змог прайсці, — сказаў кіраўнік мясцовай улады.

**Наталля КАРПЕНКА.**

# Паслугі кансьержак — платныя

**У многіх жылых дамах сталіцы, якія знаходзяцца на абслугоўванні ЖРЭА раёнаў, з'явяцца кансьержкі. Яны будуць дзяжурыць у спецыяльна уладкаваных месцах у пад'ездах. З такой ініцыятывай выступіла ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка».**

— Гэта дазволіць лепш кантраляваць санітарны і тэхнічны стан пад'ездаў, — паведаміў карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» генеральны дырэктар аб'яднання Уладзімір Раянтовіч. — Аплачваць паслугі кансьержак будуць жыльцы. Затраты невялікія. Мяркуючы па вопыце іх работы ў дамах таварыстваў уласнікаў, выходзіць ад 5 да 10 тыс. рублёў з адной кватэры ў месяц. Думаю, жыхары шматпавярховых дамоў пагодзяцца на гэтыя расходы, каб у пад'ездзе быў парадак.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск—Навіны».**

**СЕЛЬСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА**

# РАЗАМ — ЗА ЧЫСТУЮ БЕЛАВУШУ

## Абараняць зямлю і паветра ад шкодных адходаў на Століншчыне пачалі з асобнай вёскі

**Століншчына — унікальны куток Палесся. Такіх працавітых людзей, якія жывуць тут, трэба яшчэ пашукаць. У раёне 42 тысячы чалавек працаздольнага ўзросту, з іх афіцыйна працаўладкаваныя 28 тысяч. Але гэта не азначае, што астатнія жывуць на дапамогу па беспрацоўі альбо перабіваюцца з хлеба на квас, даглядаючы невялікую гаспадарку на ўласным падворку.**



Віктар Велясніцкі (злева) з удзельнікамі семінара.

Паводле слоў **намесніка старшыні Столінскага райвыканкама Міхаіла НЕСЦЯРОВІЧА**, фармальныя беспрацоўныя вырошчваюць на сваіх участках звыш 40 тысяч тон агуркоў, дзясяткі тон іншай агародніны ў год. Штолета яны адгружаюць у Расію вітамінінай прадукцыі на 14-15 мільёнаў долараў.

### Экалагічная праблема

На ўсе 500 гектараў цяплічнай гаспадаркі, якая дае пазначаны ўраджай, кожны сезон патрабуюцца сотні тон поліэтыленавай плёнкі. Пасля збору ўраджаю матэрыял, якім накрывалі цяпліцу, становіцца непрыгодным. З ім гаспадары абыходзяцца па-рознаму. Адны вязуць яе на палігон бытавых адходаў. А калі дарогу размые альбо яе разаб'юць коламі папярэднія машыны, то некаторыя выкідваюць непатрэбны груз на пад'ездзе. Іншыя, пагледзеўшы на суседа, і не імкнуцца даехаць да звалкі — пазбаўляюцца ад смецця дзе давядзецца.

Пэўная частка гаспадароў са столінскіх вёсак плёнку спальвае на сваіх прысядзібных участках. У паветра выкідваюцца ядавітыя дыяксіны, гэтай атрутай дыхаюць пры спальванні і тыя, хто так робіць, і іх суседзі. Такім чынам, утылізацыя плёнкі стала на Століншчыне сапраўднай экалагічнай праблемай.

Многія дбайныя гаспадары не раз выказвалі заклапочанасць з гэтай нагоды, а вось пашукаць шляхі вырашэння праблемы падштурхнуў вяскоўцаў Цэнтр сельскага развіцця, які дзейнічае ў Століне з 2006 года. На семінары, які Цэнтр прысвяціў пытанням экалогіі, звязаным менавіта з утылізацыяй цяплічнай плёнкі, **дырэктар установы Віктар ВЕЛЯСНІЦКІ** расказаў гісторыю ініцыятывы і яе практычнага ўвасаблення. Спецыялісты і актывісты Цэнтра сустракаліся з жыхарамі розных вёсак, дзе ёсць цяпліцы, гутарылі з людзьмі, раздавалі лістоўкі. Але найбольшы водгук гэта інфармацыя атрымала ў вёсцы Белавуша.

### Падрыхтаваць грамадства

Адна гаспадыня расказала літаральна наступнае: «Мы спальвалі за хлявом вялікую гурбу плёнкі. Прыйшлі дадому, забралі газеты са скрынкі, сярод іх аказалася і ўлётка пра шкоду спальвання. Там напісана, якія страшныя яды дыяксіны і цыяніды, што выдзяляюцца з прадуктамі гарэння, якім хваробам яны спрыяюць. Я прачытала і дастала з палічкі лякарства, бо разбалелася сэрца... Той злашчасны касцёр варушыў кіёчкам мой унук».

Людзі абмяркоўвалі паміж сабой атрыманую інфармацыю, раіліся. Паступова грамадскае меркаванне адназначна схілілася да таго, што прыйшоў час не раскідваць плёнку, не паліць яе і не звальваць тонамі на палігонах, дзе яна будзе валяцца і псаваць навакольнае асяроддзе, а збіраць і нейкім чынам перапрацоўваць.

Спачатку абмяркоўваліся варыянты збору плёнкі ў вызначаным месцы, гаварылі нават пра заахвочванне таму, хто праявіць свядомасць і прывязе плёнку сюды. Успомнілі нарыхтоўшчыкаў другаснай сыравіны савецкіх часоў. Пытанне аплаты за поліэтылен, які пабываў у карыстанні, узнімала недзе толькі пятая частка вяскоўцаў. Астатнія выказалі згоду везці яго задарма — толькі б пазбавілі іх клопату па ўтылізацыі смецця і стала чысцей у ваколіцы.

### Ангар-назапашвальнік

Выбраць месца і знайсці памяшканне аказалася не так проста. Якога-небудзь вольнага будынка патрэбных памераў у Белавушы не знайшлося. Таму вырашылі будаваць металічны ангар. Ініцыятыву падтрымала арганізацыя «Праграма малых грантаў глабальнага экалагічнага фонду», якая дзейнічае пад эгідай ААН. Былі выдзелены сродкі — 134 мільёны рублёў. Яшчэ 71 мільён выдзелілі іншыя фундатары. І неўзабаве на ўскраіне Белавушы вырас прасторны ангар з белага металу, які ўпрыгожыла вялікая шыльда-заклік «Разам — за чыстую Белавушу».

Вырашана, што ў гэтым памяшканні плёнку будуць збіраць, здрабняць, прасаваць і накіроўваць на перапрацоўку ў Мінск. У сталіцы ёсць каля двух дзясяткаў прадпрыемстваў, якія займаюцца перапрацоўкай такіх адходаў. Яны з задавальненнем згадзіліся браць сыравіну. Адзін з кіраўнікоў фірмы сказаў столінцам: «Абзваніце ўсіх і скажыце нам, якую найбольшую цану даюць вам за тону адходаў — мы дадзім больш».

### Цяжкі пачатак

Ангар узводзілі з кастрычніка па снежань. Але скончыць яго і ўвесці ў строй не змаглі, бо не хапіла грошай. Гэтым вельмі заклапочаны зараз і Цэнтр сельскага развіцця, і вясковая грамада. **Жыхар Белавушы Іван ВОЛЧЫК** вельмі рэзка выказаўся з гэтай нагоды, і яго пазіцыя зразумелая. Ён больш за 20 гадоў займаецца цяплічнай гаспадаркай, апошняе дзесяцігоддзе гэта стала асноўнай крыніцай даходаў сям'і. Ён сам прымаў удзел у будаўніцтве ангара.

— Душа балела за гэту плёнку, — кажа Іван Пятровіч. — У Белавушы, падлічылі ўжо: яе 30 тон у год ідзе. І ўсё гэта потым становіцца пагрозай для прыроды, для нашага наваколля. Таму і ўзяўся разам з іншымі за справу. Але я сумняваюся, што вясной гэты ангар запрацуе, што запрацуе калі-небудзь наогул. За адну толькі пажарную сігналізацыю патрабуюць пяць мільёнаў рублёў. А якая тут асаблівая пажарная небяспека — амаль пусты жалезны хлеў? Завяршыць электрыфікацыю — таксама трэба вялікія сродкі, а дзе іх узяць?

Тое, што новае прадпрыемства працаваць будзе, запэўнілі ўсе выступоўцы семінара, і першая з іх — **старшыня Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Тамара ЯЛКОЎСКАЯ**. Тамара Анатольеўна адзначыла, што праект, які ажыццяўляецца ў Белавушы, можна назваць справай дзяржаўнай важнасці. Але гэта першая ластаўка, а новае ніколі не бывае лёгкім. Абласны камітэт аховы прыроды будзе ўсяляк спрыяць пошуку сродкаў, каб ангар па зборы плёнкі «ажыў» не ў маі, як гаварылася да гэтага, а значна раней. Магчыма, нешта будзе перагледжана ў размеркаванні сродкаў бюджэтнага фонду аховы прыроды, але белавушская ініцыятыва не застанецца без падтрымкі. Прыклад з Тамары Ялкоўскай узяў і галоўны фундатар праекта, **каардынатар Праграмы малых грантаў Аляксандр ЛЕЎЧАНКА** і паабяцаў, што ў найбліжэйшы час яго арганізацыя таксама разгледзіць пытанне. Не выключана магчымасць, што яна дадаткова прафінансуе вясковы экалагічны праект.

### Новае прадпрыемства

А гэта значыць, што праз месяц-другі жыхары вялікай Белавушы павязуць з падворкаў плёнку не на палігоны, а ў спецыяльную пабудову. Як расказаў Віктар Велясніцкі, некаторыя з іх не палілі мінулагодні поліэтылен, а склалі яго штабелем у вольным куточку. А іншыя (хто паспеў завезці на палігон), калі даведаліся, што за старую плёнку можна будзе набыць са скідкай новую, паехалі ды забралі яе назад і таксама склалі да вясны. Як жа тут падмануць чаканні вяскоўцаў?

Але ж паўстае пытанне: хто будзе займацца працай па прыёмцы плёнкі, яе прэсаваннем, адпраўкай на перапрацоўку? Для гэтага Праўленне Цэнтра сельскага развіцця заснавала прыватнае ўнітарнае прадпрыемства. Яго статут і астатнія дакументы рыхтуюцца. Новая структура, паводле разлікаў, у самым лепшым выпадку выйдзе на нулявую рэнтабельнасць. А зарабляць грошы на сваё існаванне мусіць іншымі відамі дзейнасці. Напрыклад, змажа прадаваць новую плёнку, насенне, угнаенне, аказваць іншыя паслугі.

Пакуль у новы будынак будуць дастаўляць адходы цяплічнай гаспадаркі жыхары Белавушы. А сярод гаспадароў іншых населеных пунктаў праводзіцца агітацыя за тое, каб і яны вазілі плёнку сюды. Ангар размешчаны побач з трасай. І той, хто едзе па нейкіх справах у Столін, мог бы захапіць з сабой плёнку і, прадэманстраваўшы грамадскую свядомасць, здаць яе хоць бы з невялікай выгадай для сябе.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

# РАЗАМ — ЗА ЧЫСТУЮ БЕЛАВУШУ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

## Дзяржаўны падыход

Пра тое, якой важнай выглядае такая вось асобная вясковая ініцыятыва ў кантэксце дзяржаўных падыходаў да работы з бытавымі адходамі, гаварыў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Анатоль ЛІС**. Паводле яго слоў, «за год у краіне збіраецца больш за тры мільёны тон бытавых адходаў. І толькі 25 працэнтаў іх выкарыстоўваецца. У краінах Еўропы, ЗША паказчыкі процілеглыя, а асобныя краіны наблізіліся да працэнта перапрацоўкі, роўнага 95. Мы пакуль што забруджваем навакольнае асяроддзе адходамі сваёй жыццядзейнасці, а маглі б атрымліваць з другаснай сыравіны цяпло, газ, электраэнергію. У краіне ставіцца задача да 2015 года пабудаваць адпаведныя прадпрыемствы і выкарыстоўваць 75-80 працэнтаў камунальных адходаў. Намеснік міністра таксама паабяцаў падтрымку белавушскаму пачыну, каб навучыцца на гэтым прыкладзе, а потым выкарыстоўваць досвед першапраходцаў у іншых населеных пунктах гэтага альбо іншых раёнаў.

На семінары прысутнічалі старшыні бліжэйшых сельскіх Саветаў. Яны прыглядаліся да пачынання суседзяў, вывучалі, распытвалі. Варта зазначыць, што ўсе ўдзельнікі семінара пакідалі яго з аптымізмам. Бо заўсёды прыемна, калі нешта робіцца на карысць прыродзе, якая зачакалася ад нас патрэбнай павагі і ашчаднага стаўлення.

## Вярнуць раку да жыцця

Цікава было даведацца, якія яшчэ праекты экалагічнага характару на Століншчыне падтрымлівае Праграма малых грантаў глабальнага экалагічнага фонду. Вось што адказаў на гэта пытанне яго каардынатар Аляксандр Леўчанка:

— Зараз мы ўдзельнічаем у ажыццяўленні пяці праектаў на тэрыторыі Столінскага раёна. Адметным можна назваць узнаўленне гідралагічнага рэжыму ракі Вятліца. Гэта ўнікальная рачулка. Яна злучае сабой Прыпяць і Гарынь. Калі ўзровень вады быў вышэйшы ў Гарыні, Вятліца цякла ў Прыпяць, калі ж вышэйшая вада стаяла ў Прыпяці, маленькая рэчка цякла ў адваротным кірунку. Апошнім часам рэчка зарасла і ператварылася ў сцёкавую канаву. Ёсць намер вярнуць раку да жыцця.

Распачынаецца ўладкаванне мабільнай самаходнай пераправы праз раку Прыпяць каля вёскі Кораб'е. Сёння жыхары гэтай столінскай вёскі, руплівыя гаспадары, могуць трапіць на рынак у Лунінец, дзе ім зручней прадаваць сваю прадукцыю, толькі ў аб'езд, зрабіўшы круг у 150 кіламетраў. Паром, які вырабляецца зараз на адным з прадпрыемстваў Гомеля, аблегчыць іх жыццё. І навакольнаму асяроддзю выгада — выкіды ў паветра выхлапных газаў паменшацца ў разы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Столінскі раён.*

# НЮАНСЫ «ГОРАДА МАРЫ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

— Уцяпленне ў нас вядзецца нармальнымі тэмпамі, у адпаведнасці з планамі і фінансаваннем, — патлумачыў Сяргей Колас, — але людзі хочуць атрымаць усё і адразу. Пакуль у дамах не пачалі рабіць цеплавую мадэрнізацыю, скардзіліся жыльцы рэдка. А калі ў адным доме зрабілі вонкавае ўцяпленне, дык і астатнім захацелася.

Працуючы ў Мінску, многія фаніпальцы пераймаюць і сталічныя патрабаванні да ўзроўню добраўпарадкавання, якія потым прад'яўляюць да сваіх мясцовых улад. Зразумела, тэма добраўпарадкавання — складаная і разнапланавая, патрабуе сур'ёзных фінансавых укладанняў.

— Тое, што ЖКГ у стане зрабіць, яна робіць, — падкрэсліў старшыня гарсавета. — Зразумела, адразу ўсё не атрымліваецца. Тым больш ва ўмовах пастаяннай эканоміі. Але нашы камунальнікі імкнуцца творча падыходзіць да вырашэння пытанняў. Напрыклад, пні, якія застаюцца пасля спілоўвання аварыйных дрэў, прыгажосці гораду не дабаўляюць. А на выкарчоўванне кожнага патрабуюцца дадатковыя затраты. Таму летась мы ўвялі новую практыку: майстры службы ЖКГ выразаюць з іх невялікія скульптуры і дэкаратыўныя элементы. У выніку атрымліваюцца сімпатычныя аб'екты добраўпарадкавання, якія ўпрыгожваюць дваровыя тэрыторыі і вуліцы, робяць іх адметнымі.

## Грошы — у кішэню. Чыю?

Сельскім і пасялковым выканкамам прасцей папоўніць свой бюджэт, чым гарадам раённага падпарадкавання. Асабліва калі ёсць магчымасць праводзіць на сваёй тэрыторыі зямельныя аўкцыёны, а атрыманыя ад іх грошы накіроўваць на добраўпарадкаванне населеных пунктаў, могілак і г.д. Землямі гарадоў раённага падпарадкавання (у адпаведнасці з дзейсным заканадаўствам) распараджаюцца райвыканкамы. Грошы ад гарадскога аўкцыёну накіроўваюцца ў раённы бюджэт, а раён потым выдзяляе з іх гораду столькі, колькі палічыць мэтазгодным. Калі б гарады раённага падпарадкавання самі маглі распараджацца аўкцыённымі грашыма, то шэраг пытанняў (у прыватнасці, па добраўпарадкаванні) здолелі б «здымаць» самастойна, без задзейнічання рэсурсаў раёна. Відавочна, што такая форма ўладкавання, як горад раённага падпарадкавання, у сённяшніх умовах стала неэфектыўнай.

У дзень майго візіту ў Фаніпаль тут быў праведзены чарговы аўкцыён, на якім новых гаспадароў атрымалі два зямельныя ўчасткі, выдаткаваныя пад індывідуальнае будаўніцтва: адзін — у мікрараёне «Паўночны» — быў прададзены за 81 млн рублёў, другі — у мікрараёне «Паўднёвы» — за 37 млн. Прычым ахвотных, паводле слоў арганізатараў, было шмат — па 10 на кожны ўчастак. Цяпер для аўкцыёну рыхтуюцца яшчэ 10 участкаў у мікрараёне «Паўднёвы». Акрамя таго, на канец сакавіка ў Фаніпалі запланаваны аўкцыён па прадастаўленні 2 гандлёвых месцаў: пад гандлёвы цэнтр (стартавая цана 125 млн) і на 5-гадовую арэнду зямлі пад гандлёвы павільён.

## З надзеяй на лепшае

У горадзе не выконваецца толькі адзін сацыяльны стандарт — па працягласці вуліц з удасканаленым пакрыццём. Калі па стандарце ён павінен раўняцца 60 працэнтам ад агульнай працягласці, то ў Фаніпалі не перавышае 40. Ускладняе сітуацыю тая акалічнасць, што частка асфальтаваных дарог горада (менавіта транзітныя) знаходзіцца на балансе дарожных арганізацый, а частка — у ЖКГ. Акрамя таго, шэраг вуліц увогуле да гэтага часу не мае асфальтавага пакрыцця.

Фаніпаль, горад са 155-гадовай гісторыяй, да цяперашняга часу не мае генеральнага плана развіцця. Як патлумачыў старшыня гарсавета, генплан ужо заказаны, чакаецца, што работы па яго стварэнні будуць завершаны ў наступным годзе.

...У горадзе ёсць школа, гімназія і 4 дашкольныя ўстановы. У школе і гімназіі вучыцца 1400 дзяцей, з якіх каля 470 — у другую змену (для абмежавання вучэбнага працэсу першай зменай не хапае плошчаў).

На верасень бягучага года запланавана здаць у эксплуатацыю прыбудовы да школы №1 на 200 месцаў, дзе будуць размяшчацца 1-4 класы. Гэта суперсучасны будынак са спартыўнай, актавай заламі. Але і ён не вызваліць горад ад неабходнасці практыкаваць другую змену. А з улікам натуральнага прыросту ў хуткім часе тут зноў спатрэбяцца дадатковыя навучальныя плошчы. Варта адзначыць, што сама школа №1 мае больш чым 40-гадовую гісторыю, выдатны выкладчыцкі калектыў, але капітальнага рамонту за свой немалады ўзрост не бачыла ніводнага разу.

А яшчэ ў Фаніпалі вельмі непрэзентабельны Дом культуры, размешчаны ў старым будынку былога кінатэатра. Для горада з такімі выдатнымі дэмаграфічнымі перспектывамі патрэбна нешта больш грунтоўнае. У ідэале, лічыць старшыня гарсавета, добра было б замест цяперашняга ДК узвесці шматпрофільны аб'ект, дзе размясціць фізкультурна-аздараўленчы комплекс, музычную школу і ДК. Такі аб'ект ніколі не пуставаў бы.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

*Мінск—Фаніпаль.*

# Хто аплаціць паслугі сядзелкі

**Непрацаздольныя грамадзяне, якія цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння, адзін раз у месяц атрымаюць права на частковае пакрыццё затрат на аплату паслуг сядзелкі. Гэта прадугледжваецца змяненнямі і дапаўненнямі да Праграмы развіцця сацыяльнага абслугоўвання ў горадзе Мінску на 2011—2015 гады, якія ўнеслі дэпутаты на 7-й сесіі Мінгарсавета.**

Тарыфы на паслугі сядзелкі зацверджаны рашэннем Мінгарвыканкама ад 5 чэрвеня 2008 года № 1285 і складаюць у дзённы час 5 240 рублёў, у начны — 6 080 рублёў, у выхадныя і святочныя дні — 7 430 рублёў. Атрымліваецца, сярэдні кошт аднаго візіту сядзелкі пры ўмове 4-гадзіннага абслугоўвання ў дзённы час па будных і выхадных днях складае 23 500 рублёў. Адпаведна, у месяц выходзіць прыкладна 705 тысяч рублёў.

Паводле інфармацыі камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, у кішэню непрацаздольнага грамадзяніна штомесяц будзе вяртацца сума, роўная аднаму бюджэту пражытковага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва. Так, на 1 сакавіка БПМ склаў 296 870 рублёў. «Гэта сума пакрывае затраты на аплату паслуг сядзелкі ў сярэднім за 12 візітаў (дзён)», — удакладнілі ў камітэце.

**Наталля РАМАНОЎСКАЯ,** *«Мінск—Навіны».*

Организация:

**ОАО «Конструкторско-технологический институт средств механизации и автоматизации»**

Учетный номер плательщика: **УНП 100195557**
Вид деятельности: **производство оборудования для животноводства, птицеводства, кормопроизводства**
Организационно-правовая форма: **ОАО**
Орган управления: **ОАО «Александрийское» и ОАО «Агрокомбинат Мачулищи»**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220102, г. Минск, ул. Ангарская, 17, к 1**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | **8 781** | **10 551** |
| амортизация | 102 | **3 743** | **4 687** |
| остаточная стоимость | 110 | **5 038** | **5 864** |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | **35** | **35** |
| амортизация | 112 | **7** | **14** |
| остаточная стоимость | 120 | **28** | **21** |
| Доходные вложения в материальные ценности: | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | | |
| амортизация | 122 | | |
| остаточная стоимость | 130 | | |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | **478** | **1 946** |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | | |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| ИТОГО по разделу I | 190 | **5 544** | **7 831** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | **5 377** | **8 576** |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | **3 149** | **4 434** |
| животные на выращивании и откорме | 212 | | |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | **1 677** | **2 658** |
| расходы на реализацию | 214 | | |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | **251** | **859** |
| товары отгруженные | 216 | | |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | | |
| расходы будущих периодов | 218 | **300** | **625** |
| прочие запасы и затраты | 219 | | |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | **346** | **653** |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | | |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 231 | | |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | | |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | **3 316** | **4 651** |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | **3 130** | **2 798** |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | **138** | **1 272** |
| по налогам и сборам | 243 | | **543** |
| в т.ч. из стр. 243 «расчеты по социальному страхованию и обеспечению» | 243А | | |
| по расчетам с персоналом | 244 | | |
| разных дебиторов | 245 | **48** | **38** |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | | |
| Расчеты с учредителями | 250 | | **19** |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | | |
| прочие | 252 | | **19** |
| Денежные средства | 260 | **1 949** | **4 994** |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | **860** | **2 112** |
| денежные средства на валютных счетах | 262 | | |
| Финансовые вложения | 270 | | |
| Прочие оборотные активы | 280 | | |
| ИТОГО по разделу II | 290 | **10 988** | **18 893** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **16 532** | **26 724** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | **4 829** | **5 311** |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | |
| Резервный фонд | 420 | **60** | **83** |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | | |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | **60** | **83** |
| Добавочный фонд | 430 | **641** | **1 567** |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | **X** | **X** |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | **2 896** | **8 294** |
| Целевое финансирование | 460 | | |
| Доходы будущих периодов | 470 | | |
| ИТОГО по разделу III | 490 | **8 426** | **15 255** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | **709** | **566** |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | | |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | **709** | **566** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | | |
| Кредиторская задолженность | 620 | **6 915** | **7 298** |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | **2 101** | **1 664** |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | **4 188** | **5 129** |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | **181** | **208** |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | | |
| по налогам и сборам | 625 | **381** | **215** |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | **61** | **63** |
| по лизинговым платежам | 627 | | |
| перед прочими кредиторами | 628 | **3** | **19** |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | **482** | **3 605** |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | | |
| прочая задолженность | 632 | **482** | **3 605** |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | | |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | | |
| ИТОГО по разделу V | 690 | **7 397** | **10 903** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **16 532** | **26 724** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | | |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | **6 915** | **7 298** |

| АКТИВЫ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | **20** | **80** |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | **2** | **2** |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | | |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | | |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | | |
| Бланки строгой отчетности | 006 | | |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | | |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | | |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | | |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | | |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | **7** | **14** |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | | |
| Товары, отгруженные в отпускных ценах | 015 | | |
| Имущество, находящееся в совместном владении | 016 | | |
| Именные приватизационные чеки «Имущество» | 017 | | |
| Материалы, оборудование, принятые (переданные) в рамках гарантийных обязательств | 018 | | |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | **75 953** | **45 465** |
| в т.ч. выручка, поступившая в валюте | 010а | | |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | **12 659** | **7 321** |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | **63 294** | **38 144** |
| СПРАВОЧНО: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | **55 261** | **35 363** |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | **8 033** | **2 781** |
| Управленческие расходы | 050 | | |
| Расходы на реализацию | 060 | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | **8 033** | **2 781** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | **6** | **58** |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | | |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | **6** | **58** |
| в том числе: проценты к получению | 091 | | |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | | |
| доходы от операций с активами | 093 | | |
| прочие операционные доходы | 099 | **6** | **58** |
| Операционные расходы | 100 | **8** | **58** |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | | |
| расходы от операций с активами | 102 | | |
| прочие операционные расходы | 109 | **8** | **58** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | **-2** | |
| **III.ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | **1 271** | **758** |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | | |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | **1 271** | **758** |
| Внереализационные расходы | 150 | **1 075** | **285** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | **196** | **473** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160) | 200 | **8 227** | **3 254** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | **-5** | **258** |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+/-210-220) | 240 | **8 222** | **3 512** |
| Налог на прибыль | 250 | **1 973** | **843** |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | **218** | **107** |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | | |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | **6 036** | **2 304** |
| СПРАВОЧНО (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | | |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | | |
| Количество прибыльных организаций | 330 | **1** | **1** |
| Сумма полученной прибыли по конечному финансовому результату | 330А | **6 036** | **2 304** |
| Количество убыточных организаций | 340 | | |
| Сумма полученного убытка по конечному финансовому результату | 340А | | |

### РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| Наименование | Код | Доход | Расход | Доход | Расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | | | | |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | | | | |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | | | | |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | **546** | **1 049** | **422** | **245** |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | **1** | **1** | | **3** |
| Израсходовано на выплату компенсирующего, стимулирующего характера, а также выплаты, носящие характер социальных льгот | 391 | **X** | | **X** | |
| Безвозмездно полученные и переданные активы (включая денежные средства и суммы государственной помощи) | 392 | | | | |
| Сумма НДС, отнесенная на внереализационные расходы по товарам, отгруженным в РФ | 393 | **X** | | **X** | |
| Источники собственных средств, направленных на покрытие убытков отчетного года | 394 | | | | |
| Прочие доходы и расходы | 400 | **724** | **25** | **336** | **37** |
| **ИТОГО** | **500** | **1 271** | **1 075** | **758** | **285** |

### ГОДОВОЙ ОТЧЕТ с 1 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

Организация: **ОАО «БЕЛХИМЭНЕРГО»**

Учетный номер плательщика: **100363932**
Вид деятельности: **строительно-монтажные работы**
Организационно-правовая форма: **Открытое акционерное общество**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220024, г. Минск, пер. Асаналиева, 3**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2011 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 18 801 | 23 157 |
| амортизация | 102 | 8 474 | 10 002 |
| остаточная стоимость | 110 | 10 327 | 13 155 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 3 | 3 |
| амортизация | 112 | 1 | 1 |
| остаточная стоимость | 120 | 2 | 2 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 1 160 | 165 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **11 489** | **13 322** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 993 | 1 232 |
| в том числе: | | | |
| сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 443 | 794 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 4 | 7 |
| товары отгруженные | 216 | 529 | 417 |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | - | - |
| расходы будущих периодов | 218 | 17 | 14 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 19 | 22 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 544 | 522 |
| в том числе: | | | |
| покупателей и заказчиков | 241 | 290 | 288 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 67 | 28 |
| по налогам и сборам | 243 | 3 | 12 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 30 | 27 |
| разных дебиторов | 245 | 154 | 167 |
| Денежные средства | 260 | 491 | 731 |
| в том числе: | | | |
| денежные средства на депозитных счетах | 261 | 268 | 731 |
| Финансовые вложения | 270 | 1 020 | 1 092 |
| Прочие оборотные активы | 280 | - | 1 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **3 067** | **3 600** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **14 556** | **16 922** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 448 | 394 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | -52 | - |
| Резервный фонд | 420 | 43 | 43 |
| в том числе: | | | |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | 43 | 43 |
| Добавочный фонд | 430 | 11 186 | 13 210 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 2 256 | 2 536 |
| Доходы будущих периодов | 470 | 16 | 7 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **13 897** | **16 190** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 172 | 180 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **172** | **180** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Кредиторская задолженность | 620 | 480 | 544 |
| в том числе: | | | |
| перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 78 | 98 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | - | 195 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 180 | 115 |
| по налогам и сборам | 625 | 145 | 100 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 57 | 20 |
| перед прочими кредиторами | 628 | 20 | 16 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | 7 | 8 |
| в том числе: | | | |
| по выплате доходов, дивидендов | 631 | 7 | 8 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **487** | **552** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **14 556** | **16 922** |
| Из строки 620: | | | |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 480 | 544 |

| Активы и обязательства, учитываемые за балансом | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | 424 | 836 |
| Бланки строгой отчетности | 006 | 1 | - |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | 9 | 9 |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | 508 | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | 9 | - |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2010 года по 31 декабря 2010 года

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 5 725 | 6 417 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 945 | 1 033 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 4 780 | 5 384 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 4 170 | 4 399 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 610 | 985 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **610** | **985** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 52 | 284 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 3 | 32 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 49 | 252 |
| в том числе: | | | |
| проценты к получению | 091 | 33 | 40 |
| доходы от операций с активами | 093 | 9 | 179 |
| прочие операционные доходы | 099 | 7 | 33 |
| Операционные расходы | 100 | 24 | 216 |
| в том числе: | | | |
| расходы от операций с активами | 102 | 17 | 183 |
| прочие операционные расходы | 109 | 7 | 33 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **120** | **25** | **36** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 38 | 58 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 1 | 2 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 37 | 56 |
| Внереализационные расходы | 150 | 98 | 198 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **-61** | **-142** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)** | **200** | **574** | **879** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | -94 | 158 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | -31 | -1 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)** | **240** | **511** | **1 038** |
| Налог на прибыль | 250 | 123 | 215 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 167 | 163 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **284** | **501** |
| Количество прибыльных организаций | 330 | 1 | 1 |
| Сумма прибыли | | 284 | 501 |
| Количество убыточных организаций | 340 | 0 | 0 |
| сумма убытка | | 0 | 0 |

### РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| наименование | код | доход | расход | доход | расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | 7 | 6 | 1 | 9 |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | 29 | 24 | 42 | 40 |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | 1 | - | 9 | 8 |
| Прочие доходы и расходы | 400 | | 68 | 4 | 141 |
| **ИТОГО** | **500** | **37** | **98** | **56** | **198** |

Количество акционеров – всего 886, в том числе: юридических лиц – 3, физических лиц – 883

**Информация о дивидендах и акциях**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 1,7 | 1,5 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 7,57 | 6,68 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 71,9 | 54,2 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 31 181 |

**Информация о задолженности:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 153 | 98 |
| Просроченная кредиторская задолженность | миллионов рублей | 0 | 0 |

Среднесписочная численность работающих (человек): 134 чел.

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): строительно-монтажные работы.

По мнению аудитора бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Белхимэнерго» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Белхимэнерго» на 1 января 2011 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2010 год, при этом совершенные ОАО «Белхимэнерго» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**

**Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30.**

# АРЛІНЫ КРАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)*

Ад адной думкі, што зноў цябе чакае цесны і нязручны шалаш на замерзлым (а горш таго, ужо адталым) балоце, 8-9 гадзіннае паўсядзенне-паўляжанне на бярозавых паленах у холадзе ці пад дажджом, на душы рабілася ніякавата. Але адступаць не было куды. Пад'ём у чатыры раніцы, кубак гарбаты і спешны выезд з Целяханаў у бок Выганашчанскага возера. Залезці ў падрыхтаваны шалаш зацемна было адной з умоў поспеху. Зоркія і мудрыя арланы, не павінны бачыць ніякіх падазроных аб'ектаў і тым больш чалавека — для іх найбольшую з небяспек. Без чвэрці шэсць я ўжо «абжываўся» ў знаёмай шалашовай прасторы, выкладваў з заплечніка тэрмас і бутэрброды, каб потым не рабіць залішняга шоргату, ўладкоўваў на штатыў фотакамеру з тэлеаб'ектывам. Дзень быў пахмурны, з мокрым снегам. З аднаго боку, гэта добра, што світанак настае пазней, але з іншага — фотаздымкі атрымліваюцца цьмянаватыя, глухія. Аднак выбару не было. Я сцішыўся ў чаканні. Святла і птушак. Як рабіў гэта ў мінулы і пазамінулы разы, як рабілі іншыя ўдзельнікі фотапленэру. Шмат каму хацелася мець фотаздымкі цара птушак — арлана-белахвоста.

Дзякуючы сумеснаму праекту грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» з гідралагічным заказнікам «Выганашчанскае» многім беларускім фатографам-анімалістам выпала рэдкая магчымасць паўдзельнічаць у фотаздымках, неабходных для стварэння фотавыстаўкі. Фотавыстаўку будуць праводзіць у школах, вучыць і заклікаць дзяцей захоўваць папуляцыі рэдкіх драпежных птушак. Праект называецца «Акцыя для арлоў і людзей. Захаванне рэдкіх птушак у Выганашчанскім рэгіёне сіламі грамадскасці». На працягу шасці тыдняў ладзіліся туры з Мінска ў лыжную сталіцу — Целяханы, удзельнікаў размяшчалі ў гасцініцы, забяспечвалі харчаваннем. Умовы — лепшага не пажадаеш. Здымай — не хачу! Для паспяховых здымак загадзя былі падрыхтаваныя тры спецыяльныя пляцоўкі, дзе верагодней за ўсё і знаходзіліся арланы. Зямлянка, хлеў на старым хутары і цесны шалаш у затопленым бабрамі бярэзніку. Мясцовыя егеры Аляксандр і Пятро Івановы, Мікалай Варабей і Віктар Куратнік загадзя паклапаціліся, каб «здымшчыкам» было як мага камфортней, на прывадзе выкладвалі тушы загінулых дзікіх звяроў. Толькі адна ўмова, якую аматары незвычайнага палявання павінны былі самі і ўлічваць, і выконваць: без спецыяльнай фотаоптыкі на гэткіх здымках рабіць няма чаго. Куратар праекта біёлаг-арнітолаг Вольга Лукшыц паведаміла, што праект адбыўся пры фінансавай падтрымцы па праграме малых грантаў пасольства ЗША ў Беларусі і будзе мець выдатны працяг у адукацыі і выхаванні. Цяпер слова было за фатографамі. І большасць з іх разумелі важнасць удзелу ў здымках, што ад кожнага з іх таксама залежыць будучыня прыроды-матухны.

Першы арлан прызямліўся бясшумна. Я глянуў на гадзіннік. Было дзесяць хвілін на сёмую. Значыць маё чаканне доўжылася недзе з паўгадзіны. Зусім мала. За дваццаць метраў ад схованкі ляжаў умерзлы ў лёд воўк, амаль увесь аб'едзены птушкамі — рэшткі колішняга арлінага «банкету». Птушка агледзелася па баках і ўскінула галаву ўверх: напэўна, над шалашом сядзеў яшчэ адзін арлан. Я адчуў, як запульсавала кроў у скронях і гучна забілася сэрца. Было ад чаго: вось яна — вяршыня птушынай піраміды! Веліч і загадка прыроды. Птушка-чырванакніжнік, якой у Беларусі гняздуецца не больш за сто пар. У наступнае імгненне майму позірку адкрыўся сапраўды неверагодны сюжэт: з розных бакоў зляталіся яшчэ тры агромністыя арлы. Размах іх крылаў сягаў за два метры. Гэта былі маладыя птушкі. Бо дзюбы ў іх былі яшчэ цёмныя, а апярэнне стракатае. Старэйшы ўзрост аднаго з арланаў выдаваў яго белы хвост. Паводзіны птушак сведчылі, што месца прызямлення для іх бяспечнае. Яны бесцырымонна накінуліся на старога ваўка. Я зрабіў шчаўчок затворам, але гук арланаў не «зачапіў», клацнуў другі, трэці раз. Ніякай рэакцыі. Ці яны былі нагэтулькі згаладалыя, ці гукі фотакамеры на адлегласці не з'яўляюцца крыніцай небяспекі, засталося для мяне загадкай. Неверагодна! Каб не фотаздымкі, хто б паверыў, што перада мною літаральна за 8-10 метраў разгульвалі адразу чатыры птушыныя цары!? У гэты дзень я атрымаў найвялікшую асалоду ад жывой прыроды, назіраючы за арланамі амаль шэсць гадзін запар. Верагодна гэта была справа выпадку, бо ні назаўтра, ні праз дзень птушкі сюды больш не прыляцелі. Магчыма, узнагарода за цярпенне і вытрымку? Я гэтак і сказаў сваім калегам-фатографам: гэта быў падарунак за мае папярэднія пакуты. Дарэчы, яны таксама не засталіся без «трафеяў» — у іх атрымаліся выдатныя фотаздымкі канюкоў і ястрабаў.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**
*Івацэвіцкі раён.*










Организация:
**ОАО «СЛУЦКИЙ САХАРОРАФИНАДНЫЙ КОМБИНАТ»**

Вид деятельности: **производство сахара**
Учетный номер плательщика: **УНП 600075003**
Организационно-правовая форма: **частная**
Орган управления: **КОНЦЕРН «БЕЛГОСПИЩЕПРОМ»**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **Минская обл., г. Слуцк, ул. Головащенко, 6**

ОТЧЕТ ПРЕДПРИЯТИЯ (ОРГАНИЗАЦИИ) за 2010 год

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.**

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость (01) | 101 | 256179 | 308459 |
| амортизация (02) | 102 | 130444 | 155997 |
| остаточная стоимость | 110 | 125735 | 152462 |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость (04) | 111 | 33 | 33 |
| амортизация (05) | 112 | 18 | 21 |
| остаточная стоимость | 120 | 15 | 12 |
| Доходные вложения в материальные ценности: | | | |
| первоначальная стоимость (03) | 121 | 6874 | 4557 |
| амортизация (02) | 122 | 4584 | 3648 |
| остаточная стоимость | 130 | 2290 | 909 |
| Вложения во внеоборотные активы (07,08) | 140 | 5158 | 7771 |
| в том числе: незавершенное строительство (08) | 141 | 889 | 1209 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **133198** | **161154** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 112403 | 143398 |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы (10,15,16) | 211 | 17416 | 26532 |
| животные на выращивании и откорме (11) | 212 | | |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты (20,21,23,29) | 213 | 517 | 2308 |
| расходы на реализацию (44) | 214 | 1156 | 1298 |
| готовая продукция и товары для реализации (40,41,43,44) | 215 | 66372 | 72550 |
| товары отгруженные (45) | 216 | 24659 | 36089 |
| выполненные этапы по незавершенным работам (46) | 217 | | |
| расходы будущих периодов (97) | 218 | 2283 | 4621 |
| прочие запасы и затраты | 219 | | |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам (18,76) | 220 | 251 | 760 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | 702 | 1163 |
| в том числе: покупателей и заказчиков (62) | 231 | | |
| прочая дебиторская задолженность (60,76) | 232 | 702 | 1163 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 28714 | 19998 |
| в том числе: покупателей и заказчиков (62) | 241 | | |
| поставщиков и подрядчиков (60) | 242 | 24192 | 17258 |
| по налогам и сборам (68,69) | 243 | 4196 | 2314 |
| по расчетам с персоналом (70,71,73) | 244 | 44 | 54 |
| разных дебиторов (76) | 245 | 282 | 372 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | | |
| Расчеты с учредителями (75) | 250 | | |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд (75) | 251 | | |
| прочие (75) | 252 | | |
| Денежные средства (50,51,52,55,57) | 260 | 4284 | 100467 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах (55) | 261 | 1070 | 58476 |
| Финансовые вложения (58) | 270 | 17522 | 86487 |
| Прочие оборотные активы (79,94) | 280 | 8 | 310 |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 163884 | 352583 |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **297082** | **513737** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд (80) | 410 | 48863 | 48863 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) (81) | 411 | | |
| Резервный фонд (82) | 420 | 3153 | 3153 |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | | |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | 3153 | 3153 |
| Добавочный фонд (83) | 430 | 128819 | 184554 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода (99) | 440 | X | X |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) (84) | 450 | 26550 | 66864 |
| Целевое финансирование (86) | 460 | | |
| Доходы будущих периодов (98) | 470 | | |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 207385 | 303434 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы (67) | 510 | 240 | 520 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | | |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | 240 | 520 |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы (66) | 610 | 77316 | 138788 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 10692 | 68214 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками (60) | 621 | 7552 | 62324 |
| перед покупателями и заказчиками (62) | 622 | 398 | 1445 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда (70) | 623 | 750 | 1368 |
| по прочим расчетам с персоналом (71,73) | 624 | | |
| по налогам и сборам (68) | 625 | 588 | 1226 |
| по социальному страхованию и обеспечению (69) | 626 | 283 | 530 |
| по лизинговым платежам (76) | 627 | 338 | |
| перед прочими кредиторами | 628 | 783 | 1321 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) (75) | 630 | 1138 | 2781 |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | 1138 | 2781 |
| прочая задолженность | 632 | | |
| Резервы предстоящих расходов (96) | 640 | 311 | |
| Прочие краткосрочные обязательства (79) | 650 | | |
| ИТОГО по разделу V | 690 | 89457 | 209783 |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **297082** | **513737** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | | |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 10354 | 68214 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**с 01 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.**

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 575782 | 415097 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 52117 | 44936 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 523665 | 370161 |
| **СПРАВОЧНО** (из строки 010): Сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 407230 | 283332 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 116435 | 86829 |
| Управленческие расходы | 050 | | |
| Расходы на реализацию | 060 | 14956 | 13528 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | 101479 | 73301 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 225299 | 235648 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 250 | 254 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 225049 | 235394 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | 7187 | 1664 |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | 540 | |
| доходы от операций с активами | 093 | 216428 | 232634 |
| прочие операционные доходы | 099 | 894 | 1096 |
| Операционные расходы | 100 | 213025 | 231859 |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | | |
| расходы от операций с активами | 102 | 212435 | 230909 |
| прочие операционные расходы | 109 | 590 | 950 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | 12024 | 3535 |
| **III.ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 7129 | 5223 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 15 | 27 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 7114 | 5196 |
| Внереализационные расходы | 150 | 15730 | 20981 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационные доходов и расходов (140-150) | 160 | -8616 | -15785 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160) | 200 | 104887 | 61051 |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 5976 | 4906 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | 668 | 1189 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+210-220) | 240 | 110195 | 64768 |
| Налог на прибыль | 250 | 23891 | 10877 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 2959 | 1910 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 10 | 7 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | 78027 | 48257 |
| **СПРАВОЧНО** (из строки 300): Сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | 9747 | 18573 |

**РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ**

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| Наименование | Код | Доход | Расход | Доход | Расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | 146 | 4 | 141 | 4 |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | 94 | 145 | 351 | 210 |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | 5 | | 21 | |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | 6438 | 9646 | 3747 | 16990 |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | 59 | 108 | 98 | 30 |
| Прочие доходы и расходы | 400 | 372 | 5827 | 838 | 3747 |
| **ИТОГО** | **500** | **7114** | **15730** | **5196** | **20981** |

Фирменное наименование эмитента: **Отрытое акционерное общество «Слуцкий Сахарорафинадный комбинат»**
Местонахождение эмитента: **223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Головащенко, 6**
Банковские реквизиты эмитента: **ОАО «Белагропромбанк» г. Слуцка, код 921, р/с 3012200810018**

**Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на «1» января 2011 г.**

5. Количество акционеров – всего 5948, в том числе: юридических лиц – 22, физических лиц – 5926.

**6. Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 11078 | 3952 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 32964 | 13491 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 896 | 611 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | - | - |

**7. Информация о задолженности:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная долгосрочная дебиторская задолженность | миллионов рублей | - | - |
| Просроченная долгосрочная кредиторская задолженность | миллионов рублей | - | - |

9. Среднесписочная численность работающих (человек) – **735.**
10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: **сахар-песок.**

**Руководитель** **Н.П. Прудник**
**Главный бухгалтер** **С.А. Касабуцкая**
**«3» марта 2011 г.**


«А я думаю так...»

## ВЯСНА ІДЗЕ, ПЛАНЫ НЯСЕ...

**Пяшчотнымі прамянямі казыча вясна беларуса, кацінымі канцэртамі нагадвае пра сябе, дробным дожджыкам абуджаючы прыроду. Вясной, як ніколі, становіцца шмат закаханых. А яшчэ, як трапна жартуюць аптымісты, вясной вяртаюцца з «поўдняў» птушкі — загарэлыя і з сувенірамі. Так што не сумуем — вясну сустракаем.**

**ЧАГО ЧАКАЕЦЕ АД СЁЛЕТНЯЙ ВЯСНЫ ВЫ?**

**Людміла ЯКІМОВІЧ, «Міс Беларусь-2010»:**

— У нас у Гродне ўжо вельмі павясноваму. Вясна — гэта мая пара года. Гэта заўжды цяпло і добры настрой. Я чакаю ад сёлетняй вясны абнаўлення і здароўя, бо трошкі прастыла. Увогуле, я згодная з выказваннямі ў старажытных усходніх календарах — менавіта вясну можна лічыць Новым годам: у гэты час перараджаецца прырода. З вясной у мяне вялікія планы. Буду спадзявацца, што бліжэй да лета яны рэалізуюцца *(усміхаецца.* — **Аўт.**).

**Георгій КАЛДУН, спявак і тэлевядучы («Адзін супраць усіх», «Эстрадны карнтэйль» — тэлеканал «АНТ»):**

— Ад гэтай вясны я чакаю, каб пачалі нарэшце лічыць рэйтынгі тэлепраграм — каб ведаць, што гледачам падабаецца больш, а што не вельмі *(смяецца.* — **Аўт.**). А яшчэ, каб нарэшце правялі метро за МКАД. І каб прыйшло натхненне і я дапісаў тыя песні, якіх назбіралася ўжо даволі шмат. І я вельмі чакаю, калі ўжо прыляцяць тыя шпакі і ўладкуюць сабе гняздо пад маім дахам *(смяецца.* — **Аўт.**).

**Віка ТРЭНАС, загадчык аддзела паэзіі часопіса «Маладосць»:**

— Сакавік у мяне пачаўся з вандровак, з працоўнымі камандзіроўкамі я наведала Гародню і Ліду. Спадзяюся, вандроўкі працягнуцца — буду толькі «за». А ўвогуле гэта вясна будзе для мяне працоўнай: акрамя іншага, буду і далей весці аўтарскую калонку ў газеце «Літаратура і мастацтва». Ад вясны чакаю добрага надвор'я і цеплыні. Прычым цеплыні духоўнай. Гэтай зімой не хапала сонца, а часамі — і ўвагі родных і блізкіх. Таму я вельмі спадзяюся, што з абнаўленнем прыроды прыйдзе і абнаўленне душы.

**Аляксандр ЖДАНОВІЧ, акцёр, тэлевядучы («Калыханка», Першы канал):**

— Для мяне вясна — гэта чаканне Вялікадня. Я хаджу ў царкву, і ўвесь гэты перыяд для мяне напоўнены часам малітвы. А яшчэ за вясной прыйдзе лета, а лета — мая любімая пара года. Што да творчых задумак, то яны таксама ёсць. Адна з іх — гэта спектакль для дзетак з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, які мы рыхтуем сумесна з сябрамі.

**Таццяна КУРБАТ, прэс-сакратар тэлеканала «АНТ»:**

— Што датычыць працоўных планаў, то яны дастаткова амбіцыйныя. Мы запускаем новы сезон праекта «Бітва тытанаў» і ўжо аб'явілі кастынг удзельнікаў — вельмі спадзяюся, што будзе шмат ахвотных і мы адбяром найбольш дастойных. Таксама на вясновай павестцы — падрыхтоўка да «Еўрабачання», творчая група тэлеканала прыкладае шмат сіл і энергіі, каб не толькі наш, але і еўрапейскі глядач ацаніў песенны нумар Беларусі. У асабістых планах — надзеі таксама вялікія. Я планую прайсці стажыроўку ў прэс-службе папулярнага расійскага канала. А яшчэ ад вясны я чакаю... пакупку аўтамабіля.

**Апытваў Ільля ЛАПАТО.**

## «Чужыя» ў сваёй краіне?

**Такое пытанне ў дачыненні да абмежаванняў на пастаўку тавару з аднаго рэгіёна рэспублікі ў іншы прагучала ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці на сустрэчы з прадстаўнікамі буйнога бізнэсу.**

Кіраўнік аднаго з прадпрыемстваў Гродзеншчыны паскардзіўся, што яго прадукцыю немагчыма завезці для рэалізацыі ў некаторыя іншыя вобласці краіны (былі названыя Віцебская, Магілёўская, Гомельская). Прычым нейкіх прэтэнзій да тавару гандлем не выказваецца, а ідзе спасылка на распараджэнне мясцовых улад (зразумела, не пісьмовае) аддаваць перавагу прадукцыі гэтага рэгіёна, а не «чужой».

Як жа дзейнічаць у такой сітуацыі вытворцы, якому, па сутнасці, адмоўлена ў нармальнай канкурэнтнай працы на рынку не толькі сваёй вобласці, але і ўсёй краіны? Скарыцца перад гэтай «местачковасцю»? Ці, можа, лабіраваць ва ўладных структурах і на сваёй тэрыторыі такія ж рэгіянальныя абмежаванні?

Не, лічыць старшыня Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Сяргей Раўнейка, трэба граматна адстойваць свае правы і патрабаванні заканадаўства, якое не дазваляе падобныя хітрыкі. Вам адмовілі ў заключэнні дагавора на пастаўку прадукцыі — зрабіце адпаведны запіс у Кнізе заўваг і прапаноў. І калі ў вызначаны законам тэрмін не атрымаеце пісьмовы адказ, то ўжо мае месца адміністрацыйна-каральнае дзеянне і вам прамая дарога ў Камітэт дзяржкантролю, які павінен будзе разабрацца ў сітуацыі і прыняць неабходныя меры.

Гэта была чарговая сустрэча ў Камітэце дзяржкантролю Гродзенскай вобласці з прадстаўнікамі бізнэссупольніцтва. Першая — з індывідуальнымі прадпрымальнікамі, другая — з сярэднім звяном прадпрымальніцтва. І вось цяпер — з прадстаўнікамі буйнога бізнэсу. Праблем у іх, як паказала сустрэча, шмат, і ўсе агучаныя заўвагі, прапановы бяруцца Камітэтам дзяржкантролю, як кажуць, на аловак для выпрацоўкі адпаведных нарматыўных актаў у мэтах выканання прэзідэнцкага Дэкрэта № 4.

Разам з тым, зазначыў Сяргей Раўнейка, «капітаны вышэйшага ўзроўню, якія вядуць наш карабель эканомікі» павінны працаваць больш эфектыўна, выкарыстоўваючы найноўшыя тэхналогіі ў вядзенні бізнэсу. У прыватнасці, у маркетынгавых службах буйных прадпрыемстваў мала сапраўдных прафесіяналаў, не надаецца належнай увагі вывучэнню замежных моў, што вельмі важна для людзей, якія ўсталёўваюць дзелавыя кантакты.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Наўздагон: погляд

## РЫБА — НЕ МЯСА, АЛЕ...

**Самая вялікая праблема нашых рыбгасаў — цяжкасці са збытам прадукцыі. Насельніцтва ў сваёй большасці аддае перавагу не азёрна-рачной рыбе, а марской.**



Заняў чаргу ў рыбнай краме і пяць жанчын перад мною купілі свежамарожаную салаку і селядцоў. Салаку бралі па 3-5 кг — кажуць, што гэта звязана з пастом. А побач з крамай (кірмаш «Палескі» ў Баранавічах) фермер прадае карпа, і каля яго народ не тоўпіцца. Магчыма, тут цана адыгрывае не апошнюю ролю. Салака прадаецца па 4 тыс./кг, а цана карпа — пад 7 тыс./кг.

У Чэрвені прайшоў кірмаш «Рыба Беларусі — 2011», а таксама семінар-нарада, на якім ішла размова, як павялічыць аб'ёмы рэалізацыі рыбы і прадуктаў яе перапрацоўкі.

Пра важнасць гэтага пытання гаворыць той факт, што кірмаш наведаў і прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч.

Дык што неабходна зрабіць, каб спажывец купляў свайго карпа, а не заморскую салаку?

Нельга сказаць, што прэснаводную рыбу насельніцтва не купляе. Напрыклад, у параўнанні з 2004 годам продаж рачной рыбы летась вырас у 3,3 раза — з 4,7 тыс. тон да 15,4 тысячы. Але сёння гэтага мала.

Міністр сельскай гаспадаркі Міхаіл Русы падкрэсліў на нарадзе, што адной з галоўных прычын пагаршэння эканамічнага стану рыбгасаў з'яўляецца рост нерэалізацыі рыбы гэтымі арганізацыямі. Мне здаецца, што ў нас часам робіцца націск не на тыя моманты. Вось Мінгандаль і Мінсельгасхарч дамовіліся аб рэалізацыі прэснаводнай рыбы на 2010 год. Згодна з тым пагадненнем, гандлёвыя арганізацыі Мінгандлю і спажыўкааперацыі павінны былі прадаць 13 тыс. тон рыбы, а здолелі рэалізаваць толькі 27%. Можна дамаўляцца і падпісваць розныя пагадненні, але апошняе слова за пакупнікам: менавіта ён вырашае, якую рыбу купляць.

Ёсць нараканні — гандаль не зацікаўлены ў рэалізацыі прадукцыі перапрацоўкі са сваёй прэснаводнай рыбы. Дастаткова зазірнуць у рыбны аддзел і паглядзець на цану, па якой прадаюцца сушаныя, вяленыя і вэнджаныя карпы і шчупакі, каб згубіць да іх цікавасць.

Рыба — не мяса, але чамусьці яна прадаецца па цане мяса.

На рынку ў краме кумпяк каштуе 12 тыс/кг — у мінулую суботу сам купляў. А колькі ў карпа адходаў — кожны ведае, і хоць за яго плацім 7 тысяч, а калі рыбу ўзяць у чыстай вазе, то разбежка з мясам будзе малая.

Сельскае насельніцтва не купляе рачную рыбу не таму, што яе няма ў мясцовых крамах, а з вядомай нам нагоды: свежамарожаная марская рыба больш танная. Вясковая жанчына праходзіць міма цыстэрны з карпам і ідзе ў краму па салаку.

А тое, што вырашана сёлета ў кожным аграгарадку прадаваць прэснаводную рыбу, то гэта добра але вастрыні праблемы такі крок не здымае, бо ў сельскай краме карп не будзе больш танным — хутчэй наадварот.

Не трэба думаць , што наш чалавек не любіць рачную рыбу. Любіць, але найперш «халяўную». Дастаткова пазнаёміцца з інфармацыяй Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі.

Перспектывы і праграмы развіцця рыбнай гаспадаркі патрэбны, але калі мы заглядваем у 2015 год, то хацелася б ведаць простую рэч: цана на нашу прэснаводную рыбу будзе зніжацца ці расці з кожным годам? Рыбгасы павінны знайсці рэзервы для зніжэння сабекошту вытворчасці рыбы, і пра гэта гаварылася на нарадзе ў Чэрвені.

Я папрасіў дырэктара рыбгаса «Лактышы» (Ганцавіцкі раён) Івана Цыгана праясніць сітуацыю.

***— Іван Іванавіч, вы былі на нарадзе, і як на ваш погляд — зменіцца нешта ў рыбнай гаспадарцы да лепшага?***

— Праблема наша вядомая: гандаль неахвотна бярэ рыбу на рэалізацыю, а вазіць яе за сотні кіламетраў на аўтатранспарце нявыгадна. Але цяпер гаспадаркам дзяржава будзе вяртаць 30% затрат, а гэта істотная падтрымка.

***— Скажыце, каб вырасціць карпа ў адзін кілаграм, колькі трэба камбікорму?***

— Прыкладна каля 4 кг камбікорму, кілаграм якога каштуе тысячу рублёў. Але ж яшчэ неабходна рыбгасу плаціць людзям зарплату, падаткі, несці затраты на рэалізацыю, а трэба ж і прыбытак хоць маленькі мець.

У краме «Элара», што ў Баранавічах, паставілі ёмістасць і прадаюць карпа, якога і пастаўляе рыбгас «Лактышы». Але рыбу не вельмі ахвотна бяруць, бо тут яна значна даражэй: гандаль таксама хоча мець прыбытак.

Гандлёвая сетка імкнецца рэалізаваць тую прадукцыю, якая карыстаецца попытам, і, напэўна, прад'яўляць прэтэнзіі да гандлю не зусім справядліва.

Дзяржава падтрымала рыбную гаспадарку краіны — усклала частку затрат на саміх спажыўцоў (звычайная справа). Будзем лічыць, што гэта часовы крок, а нам найперш неабходна разабрацца, чаму вытворчасць аналагічнай рыбы ў некаторых суседніх краінах значна таннейшая, чым у нас. У эканоміцы ўсё ўзаемазвязана, і ў нашым выпадку на кошт рыбы ўплывае цана камбікармоў, паліва, падаткі... Можа, і на гэтыя моманты неабходна звярнуць увагу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# Еўразійскі саюз — рэальная перспектыва



**Днямі ў Маскве прайшоў Міжнародны эканамічны форум дзяржаў-удзельніц СНД «20 гадоў разам: досвед супрацоўніцтва і перспектывы». У ім удзельнічаў вядомы беларускі эканаміст, член Грамадска-кансультацыйнага Савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Л.Ф. Заіка. Наш карэспандэнт сустрэўся з ім і папрасіў расказаць аб ключавых момантах форуму.**

**— Леанід Фёдаравіч, прабачце за прамату, але якім ветрам вас туды занесла? Форум, як вынікае з яго назвы, быў прысвечаны юбілею, мякка кажучы, далёка не самай эфектыўнай міжнароднай арганізацыі. Уяўляю, які ж там панаваў сум: суцэльныя сухія даклады-справаздачы, у якіх напрыканцы абавязкова гучаў казённы аптымізм адносна светлай будучыні Садружнасці.**

— Па-першае, вецер тут не пры чым, мяне запрасілі выступіць на форуме. Па-другое, вы, відаць, як і многія, знаходзіцеся ў палоне старых стэрэатыпаў аб СНД. Сапраўды, раней шмат мерапрыемстваў пад эгідай СНД так і праходзілі: сумна і невыразна. Але цяперашні сакавіцкі форум, яго парадак дня выгадна адрозніваліся цікавай, змястоўнай і злабадзённай дыскусіяй, якая напрамую тычылася нашай будучыні. Вастрыню размове надаваў удзел у ёй разам з вядомымі прадстаўнікамі органаў выканаўчай і заканадаўчай улады вялікага бізнэсу, буйных інвестыцыйных і фінансавых арганізацый, даследчых і экспертных цэнтраў, прафесійных саюзаў і аб'яднанняў усіх краін Садружнасці, у тым ліку і Беларусі. Самая галоўная навіна форуму: упершыню за амаль 20 гадоў існавання СНД прагучаў і быў падтрыманы прысутнымі дакладны і ясны тэзіс аб неабходнасці фарміравання на постсавецкай прасторы новай міждзяржаўнай супольнасці пад умоўнай пакуль назвай — Еўразійскі саюз. Размова ішла аб прадуманым, узважаным фундаментальным падыходзе да будучыні шэрагу краін Садружнасці. У іх цяпер з'явілася новая стратэгічная перспектыва — Еўразійскі саюз.

**— І што ён будзе ўяўляць сабой як арганізацыя, дакладней, як новы саюз?**

— Мяркуецца, што гэта ў пэўным сэнсе будзе новая канструкцыя міждзяржаўнага будаўніцтва. Нас чакае паступовая трансфармацыя краін Садружнасці ў Еўразійскі саюз. Саюз, які павінен прыйсці на змену часам аморфнай, недакладнай, нерашучай і не заўсёды зразумелай і паслядоўнай СНД, у рамках якой лічылася нормай не выконваць сумесна прынятыя рашэнні. Невыпадкова за Садружнасцю замацавалася рэпутацыя пляцоўкі для кансультацый кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, свайго роду камунікатыўнага цэнтра, дзе яны падчас самітаў перыядычна сустракаліся, абменьваліся думкамі, поглядамі і ўражаннямі. Цяпер, безумоўна, краіны СНД падышлі да новага гістарычнага этапу ў сваім развіцці.

**— Цікавы паварот перад юбілейнай сустрэчы. Некалькі слоў аб яе выніках.**

— Арганізатарамі сустрэчы сталі Выканаўчы камітэт Садружнасці і Дзелавы цэнтр эканамічнага развіцця СНД. Магчыма, дзякуючы апошняму форум ні ў якім разе не нагадваў пустую гаварыльню. Быў зроблены глыбокі (адзначаю як эканаміст) аналіз 20-гадовай дзейнасці СНД. У рамках разгляду Стратэгіі эканамічнага развіцця Садружнасці да 2020 года ўдалося грунтоўна абмеркаваць актуальныя праблемы Дагавора аб зоне свабоднага гандлю, Міждзяржаўную мэтавую праграму інавацыйнага супрацоўніцтва, шэраг перспектыўных праектаў, акрэсліць пэўныя механізмы наступнага ўмацавання эканамічнага супрацоўніцтва краін Садружнасці. Гэтаму ў многім садзейнічала работа дыялогавай пляцоўкі «Развіццё дзелавога клімату ў СНД: прэзентацыя магчымасцяў». Удзельнікі дыскусій змаглі абмяняцца меркаваннямі з прадстаўнікамі органаў выканаўчай улады і бізнэсу для наступнага пашырэння дзелавых сувязяў. Завяршыўся форум прыняццем выніковага дакумента, які, відаць, ужо перададзены ў вышэйшыя органы заканадаўчай і выканаўчай улады краін Садружнасці ў якасці аналітычнай і рэкамендацыйнай інфармацыі. Мэты форуму, на мой погляд, былі дасягнутыя.

**— А як удзельнікі форуму паставіліся да стварэння Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, вынікаў пасяджэнняў Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы і Міждзяржаўнага савета Еўразійскай эканамічнай супольнасці (Вышэйшага органа Мытнага саюза) на ўзроўні кіраўнікоў урадаў трох краін, якія нядаўна прайшлі ў Мінску?**

**Нас чакае паступовая трансфармацыя краін Садружнасці ў Еўразійскі саюз.**

— Гэта тэма выклікала ў іх асаблівы і вялікі інтарэс. А падвядзенне першых вынікаў дзейнасці Мытнага саюза і перспектывы стварэння Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП) увогуле, калі казаць сучаснай моладзевай мовай, сталі «хітом» форуму. Многія ўдзельнікі форуму разглядалі гэтыя знакавыя зрухі на постсавецкай прасторы як платформу, пачатак, першыя крокі ў напрамку стварэння палітычна ўплывовага і эканамічна магутнага, незалежнага, сацыяльна ўстойлівага Еўразійскага саюза. Аб ім палітыкі, навукоўцы, эксперты, аналітыкі, палітолагі гаварылі нават як аб увогуле новым цывілізацыйным аб'яднанні.

**— Не здалося вам, што гэта ідэя — новая чарговая і добра замаскіраваная ініцыятыва Крамля для ўмацавання свайго ўплыву ў постсавецкіх рэспубліках?**

— Не здалося. Крэмль я бы тут разглядаў як адно з цэнтральных звенняў будучага новага саюза. У Маскве, як і ў Мінску і Астане, выдатна разумеюць, што тое «воблака ў штанах», якім усе 20 гадоў фактычна з'яўлялася СНД, у свеце сучасных міжнародных выклікаў не можа ўжо існаваць у сістэме былых каардынат. Хопіць краінам СНД займацца самаідэнтыфікацыяй, пераконваць іншых у сваёй значнасці і самастойнасці. Памятаеце, напрыклад, у Грузіі і Украіны на ўсе праблемы быў свой пункт погляду, свае падыходы да іх вырашэння і г. д. Можна было падпісаць ва ўрачыстай абстаноўцы падчас саміту пакет важных міждзяржаўных дакументаў, а потым іх не выконваць ці выконваць выбарачна, толькі тыя, якія здаюцца правільнымі. А жыццё тым часам няўмольна ішло наперад, нашы ўзаемаадносіны са знешнім светам паступова пераходзяць у іншае рэчышча. Таму Еўразійскі саюз можна разглядаць як вымушаную, але своечасовую меру.

**— І яго асновай стане Садружнасць Незалежных Дзяржаў?**

— Не зусім так. Тут не ў змене назвы справа, а ў сутнасці новага саюза. Яго ядро ўжо ёсць — Беларусь, Расія і Казахстан. Яны здолелі пераадолець рознагалоссі, супярэчнасці, дамовіцца па прынцыповых пытаннях і стварыць рэальна дзейны Мытны саюз, ушчыльную падысці да стварэння Адзінай эканамічнай прасторы. Чым не прыклад для іншых краін СНД? Бо ў межах «тройкі» ёсць рынак свабоднага руху тавараў, капіталаў і працоўнай сілы. Дадайце сюды магутны міжнародны фінансавы цэнтр АЭП. Усё гэта будзе садзейнічаць істотнаму ажыўленню дзелавой актыўнасці. Дарэчы, такім шляхам некалі рухалася наперад еўрапейская інтэграцыя. Яе здабыткі і няўдачы ўяўляюць для нас карысны досвед. Яго неабходна ўлічваць.

**— Але як улічваць асаблівую пазіцыю такой важнай краіны-ўдзельніцы СНД, як Украіна? Яна, як вядома, усімі фібрамі сваёй украінскай душы імкнецца ў другі саюз — Еўрапейскі. Як тут быць з нашай паўднёвай славянскай суседкай?**

— Я бы параіў спачатку яе палітыкам кінуць спробы з камфортам уладкавацца адразу на двух крэслах. У палітыцы гэты заняў так рызыкоўны. Можна зваліцца і балюча ўдарыцца. Таму Украіне трэба дакладна вызначыцца: з кім яна мяркуе звязаць свой лёс — з Еўразійскім ці Еўрапейскім саюзам? З апошнім яе палітыкі мараць аб стварэнні зоны свабоднага гандлю, увогуле далучыцца да Еўрасаюза ў рэшце рэшт. Марныя спадзяванні. У бліжэйшыя 10 гадоў гэта пытанне нават не будзе сур'ёзна разглядацца ў Брусэлі. Так, нешта паабяцаюць украінскім братам, паляпаюць па-сяброўску па плячы, дадуць так званыя хатнія заданні ў якасці падрыхтоўкі для наступных тэстаў, але ўсё пакуль хутчэй за ўсё абмяжуецца на ўзроўні перамоў і размоў. Хопіць Брусэлю галаўнога болю з Грэцыяй, Партугаліяй, Іспаніяй. ЕС ужо не хоча браць на эканамічны буксір новыя праблемныя краіны. А пасля ўступлення Украіны ў ЕС там не хопіць сродкаў ніякіх стабілізацыйных фондаў, золатавалютных запасаў. Атрымоўваецца, што для Украіны застаецца ўсё менш часу, каб даць канчатковы адказ наконт членства ў Еўразійскім саюзе. Таму што быць адразу ў двух інтэграцыях немагчыма.

**— Між іншым, літаральна за тры дні да маскоўскага эканамічнага форуму СНД у Мінску старшыня ўрада Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін на прэс-канферэнцыі даў адназначна зразумець, што наступствы недалучэння да Мытнага саюза будуць цяжкімі для Украіны. Ён мае рацыю?**

— Так. Сказана даволі жорстка, але прынцыпова і, па сутнасці, правільна. На форуме ў Маскве Украіну ў больш мяккай форме заклікалі зрабіць свой выбар, маўляў, уважліва паглядзіце, дакладна ацаніце, з кім вам будзе лепш. Я, напрыклад, падчас дыскусіі выказаўся за тое, каб членства ў Мытным саюзе новых краін было поўным і без усялякіх адхіленняў, са строгай дысцыплінай выкання ўсіх узятых абавязацельстваў. Толькі тады Мытны саюз і Адзіная эканамічная прастора будуць эфектыўнымі, інакш яны паўтораць сумны лёс СНД. Я ўпэўнены, што лідарам Беларусі, Расіі і Казахстана ні ў якім разе не трэба рознымі пернікамі заманьваць Украіну ў Мытны саюз на асаблівых умовах. Ён тады развалiцца. Усе правілы гульні аднолькавыя для ўсіх.

Няма сярод уплывовых украінскіх палітыкаў аднадушнасці па гэтым пытанні? Няхай тады правядуць рэферэндум. Такім чынам у свой час да ЕС далучаліся многія яго новыя члены. Гэта справядліва і аб'ектыўна. Народу Украіны вырашаць, як яму жыць надалей. А вось тактыка сядзення на двух крэслах можа прывесці да таго, што Украіна не трапіць ні ў Еўразійскі, ні ў Еўрапейскі саюз. Наступствы гэтага сапраўды будуць цяжкімі.

**— А да якой структуры Украіне было б лагічна далучыцца?**

— Яе эканамічная актыўнасць, шматлікія дзелавыя сувязі і інтарэсы знаходзяцца пераважна ў Расіі і Беларусі, крыху менш у Казахстане. І я не думаю, што пасля (уявім такое) стварэння Украінай зоны свабоднага гандлю з Еўрасаюзам нам стане горш. Не. Украіне стане горш, яна страціць сваіх гістарычных і стратэгічных партнёраў.

**— А можа, Украіна разумнейшая за нас і не бачыць будучыні для Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, а таму і не імкнецца туды? Ці ёсць у іх будучыня? Што гаварылі на форуме ў Маскве на гэты конт?**

— Дыскусій было шмат. Большасць выступоўцаў казала: вялікім плюсам Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы з'яўляецца тое, што яны фарміруюцца па прынцыпах Сусветнай гандлёвай арганізацыі. А гэта абумоўлівае ў будучыні больш хуткае, чым здаецца сёння, эканамічнае збліжэнне з Еўрапейскім саюзам — нашым вельмі важным гандлёвым партнёрам. Дык чаму б і Украіне не выбраць такі шлях збліжэння з любімым ёю ЕС? І хто ведае, можа, з часам збліжэнне двух саюзаў скончыцца стварэннем адзінай эканамічнай прасторы ад Атлантычнага да Ціхага акіяна. Мы жывём у эпоху імклівых змен і пераўтварэнняў.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

**ОАО «Родина Дзержинского»** Столбцовского района Минской области **приглашает на работу зоотехников (заведующих ферм), ветврача, ветфельдшера, механизаторов, животноводов.**

Предоставляется благоустроенное жилье.

**Контактные телефоны: 8 (01717) 40 200, 40 139.**

УНП 600022393

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже имущества**

— здание бывшего сушильно-тепличного комплекса, инв. № 621/С-19822, пл. 436,9 кв. м, по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, в р-не д. Козлы, начальная цена продажи с учетом НДС — 4148632 бел. рубля, сумма задатка — 414863 бел. руб., для обслуживания здания выделен земельный участок площадью 0,2131 га. Продавец имущества: ОАО «Новая жизнь». Аукцион состоится **26.04.2011 г.** в **16.00** по адресу: Минская область, Несвижский район, д. Оношки, ул. Коммунистическая, 13. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни **с 8.00 до 17.00** по **25.04.2011 г.** включительно по адресу: 222602, Минская обл., Несвижский р-н, д. Оношки, ул. Коммунистическая, 13, контактные телефоны: 8 01770 36317, 36334.

**Задаток, указанный выше, перечисляется на расчетный счет 3012200790013 в АПБ г. Несвиж, код 916, УНН 600038074, ОКПО 03820726. Объект продается под создание производства. Порядок проведения аукциона оговорен Положением о проведении аукционов по продаже объектов, принадлежащих на праве собственности ОАО «Новая жизнь». Договор купли-продажи заключается в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Затраты по проведению аукциона и заключению договора купли-продажи несет покупатель.**

## ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ИМ. Н. ГАСТЕЛЛО»

Учетный номер плательщика: **100010116**
Вид деятельности: **производство общемашиностроительных узлов и деталей**
Организационно-правовая форма: **ОАО**
Орган управления: **ОАО «Амкодор»**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220073, г. Минск, ул. Пинская, 18**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 24 217 | 30 215 |
| амортизация | 102 | 14 554 | 14 540 |
| остаточная стоимость | 110 | 9 663 | 15 675 |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | - | - |
| амортизация | 112 | - | - |
| остаточная стоимость | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные ценности: | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | 447 | 667 |
| амортизация | 122 | 376 | 547 |
| остаточная стоимость | 130 | 71 | 120 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 365 | 180 |
| В том числе: незавершенное строительство | 141 | - | - |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **10 099** | **15 975** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 3 039 | 3 917 |
| В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 1 592 | 2 334 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | 651 | 943 |
| расходы на реализацию | 214 | - | - |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 787 | 625 |
| товары отгруженные | 216 | - | - |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | - | - |
| расходы будущих периодов | 218 | 9 | 15 |
| прочие запасы и затраты | 219 | - | - |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 192 | 273 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | - | - |
| В том числе: покупателей и заказчиков | 231 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | - | - |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 4 144 | 4 716 |
| В том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 2 094 | 4 166 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 36 | 92 |
| по налогам и сборам | 243 | 5 | 222 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 11 | 41 |
| разных дебиторов | 245 | 1 998 | 195 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | - | - |
| Расчеты с учредителями | 250 | - | - |
| В том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | - | - |
| прочие | 252 | - | - |
| Денежные средства | 260 | 233 | 274 |
| В том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | - | 236 |
| Финансовые вложения | 270 | 2 | 2 |
| Прочие оборотные активы | 280 | 145 | 180 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **7 755** | **9 362** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **17 854** | **25 337** |
| **ПАССИВ** | **Код строки** | **На начало года** | **На конец отчетного периода** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 10 535 | 13 828 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | - | -53 |
| Резервный фонд | 420 | 24 | 24 |
| В том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | 24 | 24 |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | - | - |
| Добавочный фонд | 430 | 1 827 | 2 806 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | - | - |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | - | 190 |
| Целевое финансирование | 460 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 470 | 1 | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **12 387** | **16 795** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | - | 3 134 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **3 134** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 897 | 100 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 4 559 | 5 297 |
| В том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 3 371 | 4 435 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 15 | 49 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 143 | 264 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | - | - |
| по налогам и сборам | 625 | 128 | 3 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 22 | 74 |
| по лизинговым платежам | 627 | | - |
| перед прочими кредиторами | 628 | 880 | 472 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | 11 | 11 |
| В том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | 11 | 11 |
| прочая задолженность | 632 | - | - |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **5 467** | **5 408** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **17 854** | **25 337** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | - | - |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 4 559 | 5 297 |

| АКТИВЫ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | 239 | 239 |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | - | 744 |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | 35 | 33 |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | - | - |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | - | - |
| Бланки строгой отчетности | 006 | - | - |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | -1 615 | - |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | - | - |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | - | - |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | - | - |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 35 123 | 16 729 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 5 854 | 2 660 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 29 269 | 14 069 |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 28 972 | 14 900 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 297 | -831 |
| Управленческие расходы | 050 | - | - |
| Расходы на реализацию | 060 | - | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **297** | **-831** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 569 | 201 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 75 | 30 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 494 | 171 |
| В том числе: проценты к получению | 091 | - | - |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | - | - |
| доходы от операций с активами | 093 | - | - |
| прочие операционные доходы | 099 | 494 | 171 |
| Операционные расходы | 100 | 342 | 156 |
| В том числе: проценты к уплате | 101 | - | - |
| расходы от операций с активами | 102 | - | - |
| прочие операционные расходы | 109 | 342 | 156 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **120** | **152** | **15** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 92 | 66 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | - | 1 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 92 | 65 |
| Внереализационные расходы | 150 | 207 | 348 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **-115** | **-283** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)** | **200** | **334** | **-1 099** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 210 | 351 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | | 7 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)** | **240** | **544** | **-755** |
| Налог на прибыль | 250 | 131 | - |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 12 | 72 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 1 | 5 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **190** | **-1 176** |
| Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | - | - |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | - | - |
| Количество прибыльных организаций / сумма прибыли | 330 | 1/190 | 0/0 |
| Количество убыточных организаций / сумма убытка | 340 | 0/0 | 1/1176 |

### РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| наименование | код | доход | расход | доход | расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | - | - | 3 | 1 |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | - | 11 | 7 | 62 |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | - | - | - | - |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | - | - | - | - |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | 27 | - | - | - |
| Прочие доходы и расходы | 400 | 65 | 196 | 55 | 285 |
| **ИТОГО** | **500** | **92** | **207** | **65** | **348** |

### ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ИМ. Н. ГАСТЕЛЛО» И ЕГО ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПО СОСТОЯНИЮ на 1 января 2011 г.

5. Количество акционеров, всего – 407, в том числе: юридических лиц – 2, физических лиц – 405.

**6. Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тысяч рублей | 6,231 | 5,735 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | 5368 | - |

**7. Информация о задолженности (только в составе годового отчета):**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 385 | 2313 |
| Просроченная кредиторская задолженность | миллионов рублей | 564 | 1943 |

**9. Среднесписочная численность работающих (человек) – 181.**

**10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): мосты ведущие.**

**Руководитель** **Н.О. Пырко**

**Главный бухгалтер** **Ю.В. Макейчик**

**26.02.2011 года**

Архіўная сенсацыя: погляд

# БАРАЦЬБА ЗА НАЦЫЯНАЛЬНУЮ САМАСВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ,

## або Навошта Сталін у 1944 годзе аформіў беларускую дзяржаўнасць?

*(Працяг. Пачатак гутаркі з вядомым гісторыкам Уладзімірам Гуленкам — у нумары за 23 сакавіка)*

**— Катынь таксама адыграла ў савецка-польскіх стасунках таго часу сваю ролю?**

— Так, па-майстэрску ўдар савецка-польскай спрэчцы нанесла Германія ў 1943 годзе, калі выцягнулі на паверхню «Катынскі расстрэл»: глядзіце, савецкая ўлада расстраляла 20 тысяч палякаў (расстраляныя ў Катыні былі перш за ўсё афіцэры і жандары, частка якіх праявілі садызм супраць савецкіх грамадзян у 1919-1922 гадах, радавыя ж з простанароддзя, а іх была большасць, па розных звестках ад 100 да 250 тысяч чалавек, у асноўным расстрэлу пазбеглі). Гэта зараз прызнаны факт. А тады? Савецкі Саюз кажа: не, гэта не мы, гэта немцы. Міжнародная супольнасць Гітлеру не паверыла, а вось польскі ўрад паверыў і публічна пра гэта заявіў. У выніку адносіны з польскім урадам у эміграцыі былі разарваныя і Сталін пачаў разыгрываць новую карту — стварэнне іншых палітычных сіл, якія б прыйшлі да ўлады ў пасляваеннай Польшчы. Партызанскія фарміраванні АК, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, былі аб'яўлены па-за законам. Па міжнародным праве яны прыраўноўваліся да незаконных замежных узброеных фарміраванняў, якія дзейнічалі на тэрыторыі іншай дзяржавы.




Задаволіць тэрытарыяльныя патрабаванні СССР можна было толькі за кошт тэрыторыі суседніх краін — Фінляндыі, Румыніі і Польшчы. Калі з першымі дзвюма пытанне было больш простае, бо яны ваявалі на баку Гітлера, то з Польшчай было больш складана — палякі з самага пачатку Другой сусветнай вайны ваявалі з Гітлерам, а значыць, былі на баку пераможцаў.

27 красавіка 1945 года на пасяджэнні канферэнцыі ААН была аднадушна прынятая рэзалюцыя аб уключэнні БССР і УССР у заснавальнікі новай міжнароднай арганізацыі. А 16 жніўня 1945 года СССР і Польшча падпісалі дагавор аб савецка-польскай мяжы. У выніку Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна засталіся ў складзе БССР і УССР адпаведна. Прычым палякі згубілі важны для сябе Львоў, але затое атрымалі Беласток, які на працягу 1939-1941 гг. быў у складзе Беларусі. Я мяркую, што, як не дзіўна, мы страцілі Беласток таму, што ў нас быў вельмі слабы нацыяналістычны рух. Калі б у нас было нешта накшталт як ва Украіне, Польшчы і Літве, сітуацыя была б іншай. У 1942-44 гадах на тэрыторыі Заходняй Украіны і ў тым ліку на беларускім Палессі разгарнулася жорсткая ўкраіна-польская вайна: палякі лічылі гэтыя тэрыторыі сваімі, а ўкраінскія нацыяналісты — сваімі. Яна, магчыма, была справакаваная спецслужбамі. Выцясненне і знішчэнне палякаў з Палесся, Валыні і ў цэлым Заходняй Украіны, вайна ўкраінскіх і польскіх нацыяналістаў былі выгадныя не толькі Гітлеру, але і Сталіну.

А так Беларусь па выніках Вялікай Айчыннай вайны згубіла тэрыторыю — амаль 20 тысяч квадратных кіламетраў, якія адышлі да Польшчы. Здаецца, гэта адзіная такая краіна з лагера пераможцаў. Самае крыўднае, што ў Беластоку, дарэчы, і адбыўся народны сход, на якім было абвешчана пра аб'яднанне беларускага народа ў адной дзяржаве.

Сталін зрабіў стаўку на стварэнне пракамуністычных польскіх партый і ўзброеных фарміраванняў, якія ўваходзілі ў Польшчу як вызваліцелі. І таму прымусіў заходнія краіны лічыцца з гэтымі палітычнымі структурамі, прымусіў міжнародныя структуры іх прызнаць.

**— Давайце пагаворым больш падрабязна пра тое, чым жа саветы выйгралі барацьбу, як вы кажаце, за нацыянальную самасвядомасць...**

— Глядзіце, што савецкая ўлада несла беларусам. Возьмем простага беларускага хлопца: адукацыя адкрыта — ідзі ў школу, ПТВ, тэхнікум, ВНУ. Вядома, была ідэалагічная зашоранасць, але, па вялікім рахунку, для жыцця ўсё было: тэатры, навукова-даследчыя інстытуты, будоўлі камунізму і г.д. Беларус меў магчымасць зрабіць кар'еру, ён ведаў правілы гульні, па якіх трэба жыць. Палякі, напрыклад, такіх шанцаў не давалі — яны беларусаў за нацыю не лічылі, беларускія школы пазакрывалі і гэтак далей. І ў вайну прапольскія імкненні беларускіх нацыяналістаў былі знішчаны на пні — палякі не пагадзіліся ствараць для беларусаў культурна-нацыянальную аўтаномію, пра што мы ўжо пісалі раней.

Вось, напрыклад, яшчэ адзін факт, які сведчыць пра тое, што давала савецкая ўлада беларусам. Мы ўжо пісалі, што ў 1940 годзе ўвесь партыйны апарат БССР быў пасаджаны за парты, наняты настаўнікі, закуплены падручнікі — усе супрацоўнікі павінны былі вывучыць і здаць іспыты па беларускай мове. Беларускі чытач мала ведае пра нацыянальную палітыку камуністаў напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Мяркую, для чытачоў будзе сенсацыяй гэты дакумент — пастанова ЦК КП(б) Беларусі «Аб вывучэнні беларускай мовы ў ВНУ, тэхнікумах і школах БССР» ад 24-25 студзеня 1941 года. У прыватнасці, у ім адзначаецца: «...Асобныя кіраўнікі органаў народнай адукацыі, дырэктары ВНУ, тэхнікумаў і сярэдніх школ у практыцы сваёй працы грэбуюць выкладаннем асноўных прадметаў на беларускай мове. Чытанне лекцый, вядзенне дакументацый, размова з навучэнцамі, як правіла, вядзецца ва ўсіх ВНУ і ў значнай частцы тэхнікумаў і сярэдніх школ на рускай мове. **Гэтым самым дапускаецца найгрубейшая палітычная памылка ў справе падрыхтоўкі і выхавання беларускіх кадраў»** (вылучана аўт.). Там жа прыводзяцца звесткі, што літаратуры для беларускіх вучэбных устаноў на беларускай мове выдаецца толькі 40%, і гэта, на думку бюро кампартыі, недапушчальна мала. Гэта, нагадваю, студзень 1941 года. А сёння ў нас сітуацыя? Вось і параўнайце. Чаму моўнае пытанне ўзнікла тады? Чытаем дакладную запіску намесніка загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б таварыша Рыўкінай таго ж года, якая была падрыхтавана пасля звароту нейкага т. Дуброўскага ў газету «Праўда». Вось што напісана ў запісцы: «Праверкай цэлага шэрагу ВНУ і тэхнікумаў у рэспубліцы выяўлена, што выкладанне ўсіх прадметаў, за выключэннем беларускай мовы і літаратуры, вядзецца на рускай мове». І далей факты — у Мінскім Юрыдычным інстытуце ў 1940-41 навучальным годзе нават не былі праведзены прыёмныя іспыты па беларускай мове, у БДУ «вывучэнне беларускай мовы праходзіць фармальна, студэнты пагардліва ставяцца да гэтага ўрока», у Гомельскім педінстытуце да 1937 года большасць прадметаў выкладалася па-беларуску, але апошнім часам усе выкладчыкі, нават якія добра валодаюць беларускай мовай, выкладаюць на рускай і г.д. Ну і пішацца пра тое, што ў шэрагу школ не вядзецца барацьба за чысціню і культуру мовы: напрыклад, настаўніца Гадзілаўскай пачатковай школы Рагачоўскага раёна т. Чырыкава ўрок рускай мовы ў чацвёртым класе праводзіла так — «потым буду вызывать вас к досцы», «у нас суфікса тут немашака». Гэтая дакладная запіска абмяркоўвалася на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б, і вось некалькі цытат са стэнаграмы:

«Панамарэнка: Педагагічнае вучылішча рыхтуе настаўнікаў для Беларусі, для беларускіх школ, а выкладанне вядзецца на рускай мове.

Уралава: Прыводзіла да няведання мовы і беларускай, і рускай.

Панамарэнка: Тав. Савіцкі, у вас што, усё вядзецца на рускай мове?

Савіцкі: Большасць.

Панамарэнка: Якія заўвагі?

Рыўкіна: Праверан быў цэлы шэраг ВНУ, школ і тэхнікумаў. Інстытут народнай гаспадаркі, Юрыдычны інстытут, там няма нічога на беларускай мове. У 1939-1940 гадах нават прыёмачных іспытаў не было па беларускай мове.

Панамарэнка: Між іншым, аддзелы адукацыі таксама вядуць перапіску на рускай мове. Я мяркую, не лішнім было б заслухаць тав. Былінскага. Дырэктыва ў нас была аб пераводзе.

Рыўкіна: Мы цікавіліся; кадры, якія выпускаюцца ў Беларусі, застаюцца цалкам у Беларусі. Горацкі сельскагаспадарчы інстытут спасылаецца, што гэта інстытут саюзнага значэння. У іх выпускаецца шматтыражка на беларускай мове, яны неаднаразова ставілі пытанне аб пераводзе шматтыражкі на рускую мову, матывуючы зноў тым, што інстытут саюзнага значэння.




Панамарэнка: Трэба было адхіліць, грубае скажэнне.

Рыўкіна: Узяць тэхнікумы — тое самае: за выключэннем беларускай мовы, выкладанне вядзецца на рускай мове».

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

*(Працяг будзе.)*

# 5 ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ, (5 суб'ектыўных меркаванняў)

## пра якія павінен ведаць кожны беларус

**ГІСТОРЫЯ, напэўна, самая спрэчная і суб'ектыўная з усіх навук. Усе мы ведаем, што калі валодаць майстэрствам красамоўства і дарам інтэрпрэтацыі, то адну і тую ж гістарычную падзею можна трактаваць абсалютна па-рознаму. Каму як выгадней. Вядомы англійскі кінарэжысёр Пітэр Грынуэй у адным са сваіх фільмаў выказаўся на гэты конт: такой з'явы як гісторыя, не існуе — існуюць толькі гісторыкі. Цяжка не пагадзіцца. Тым не менш нейкія «базавыя» падзеі для сусветнай гісторыі альбо для гісторыі асобнай краіны ці нацыі ўсё-ткі ёсць. Праўда, кожны ўсё адно мае свой «хіт-парад» значных гістарычных падзей, які складаецца ў залежнасці ад роду дзейнасці, складу характару, асабістага лёсу і схільнасцяў школьных настаўнікаў гісторыі. Бясспрэчна адно: калі чалавек не ведае сваіх каранёў, свайго мінулага, то будучыня яго не мае сэнсу, не мае перспектыў. А значыць, будучыні яго не існуе. Якія ж гістарычныя падзеі павінен ведаць кожны беларус, каб мець права і гонар звацца беларусам, каб быць годным прадстаўніком нацыі? «Звязда» папрасіла прадстаўнікоў розных творчых прафесій (бо творчых людзей можна справядліва лічыць самымі чуйнымі да важных дат для гісторыі краіны) вызначыць сваю пяцёрку гістарычных падзей, якія асабіста яны лічаць важнымі. І якія, на іх думку, павінен абавязкова ведаць кожны беларус. Пісьменнік, спявачка, музыка, мастак і кінарэжысёр выказалі думку, што без ведання сваёй гісторыі немагчыма развіццё і існаванне нацыі. Але ў кожнага з іх свае творчыя арыенціры, а таму — адрозны падыход у вызначэнні ключавых гістарычных дат. Самай крэатыўнай аказалася пяцёрка ад мастака Руслана Вашкевіча. Ён падышоў да «задання» як сапраўдны прадстаўнік сучаснага актуальнага мастацтва: неардынарна і чуйна. Але выходзіць, што беларусы павінны быць дасведчанымі і ў гісторыі грамадства, і ў гісторыі культуры, і ў ваеннай гісторыі. Зрэшты, некаторыя падзеі ў апытаных супадаюць. Але гэта толькі пацвярджае іх важнасць.**

<u>Анатоль БУТЭВІЧ, пісьменнік, грамадскі дзеяч:</u>



**1. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага.** Трэба ведаць не толькі таму, што гэта была першая беларуская дзяржава. Зрэшты, сапраўдным яе ядром была Чорная Русь — гэта Верхняе і Сярэдняе Панямонне (або Сярэдняя гістарычная Літва, як яе называлі). Разам з утварэннем ВКЛ трэба ведаць дату аб'яўленне Навагародка сталіцай княства, дзе была першая рэзідэнцыя першага вялікага князя і адзінага караля ВКЛ Міндоўга. Гэта 1240-ыя гг. Гэта нам трэба ведаць дзеля таго, каб ніколі больш не саромецца сваёй уласнай гісторыі. Бо вядома, што ў савецкі час мы не толькі не ведалі Вялікага Княства Літоўскага, але і было небяспечна ведаць пра вялікіх князёў Літоўскіх.

**2. Крэўская унія. 1385 год.** У выніку гэтага пагаднення вялікі князь Літоўскі Ягайла стаў каралём польскім, пераехаў у Кракаў і адначасова заставаўся найвышэйшым князем літоўскім. У выніку Крэўскай уніі ВКЛ, на мой погляд, яшчэ больш выйшла на еўрапейскі прастор. Акрамя таго, у выніку гэтага ўтварылася знакамітая каралеўская дынастыя Ягелонавічаў у нас, або Ягелонаў у Польшчы. І вядома, што яна была заснавана Ягайлам з нашага Крэва і князёўнай Соф'яй Гальшанскай з нашых Гальшан.

**3. 1410 год. Грунвальдская бітва народаў.** Так я яе называю, менавіта народаў. Бо там сапраўды з абодвух бакоў удзельнічалі прадстаўнікі многіх еўрапейскіх народаў. Гэтую падзею трэба ведаць дзеля таго, каб вучыцца, як абараняць свой дом, сваю зямлю.

**4. Распрацоўка і выданне Статутаў Вялікага Княства Літоўскага.** І першага — 1529 г., і наступных 1566 і 1588 года, якія некалькі стагоддзяў былі на ўсю Еўропу адзіным заканадаўчым дакументам і ВКЛ, і як узор для іншых краін. Гэта трэба ведаць для таго, каб разумець, як трэба ствараць прававую дзяржаву і законы, якія гэта забяспечваюць.

**5. 1941—1945 гг. Вялікая Айчынная вайна.** У вялікай расшыфроўцы гэта падзея не мае патрэбы. Яе трэба ведаць для таго, каб ушанаваць сапраўдную мужнасць народа і навучыцца, чаго і як не трэба рабіць.

<u>Паліна СМОЛАВА, спявачка:</u>



**1. Утварэнне новай федэратыўнай дзяржавы — Рэч Паспалітая.** У 1569 годзе пачалася новая эпоха ў беларускай гісторыі. Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае падпісалі Люблінскую унію і аб'яднаіся ў адну дзяржаву. Гэтую дату я запомніла яшчэ са школы. Думаю, што кожны беларус павінен ведаць асноўныя гістарычныя падзеі сваёй роднай дзяржавы.

**2. Вялікая Айчынная вайна.** Думаю, усе ведаюць, колькі беларусаў склалі свае галовы на алтар Перамогі ў гэтай маштабнай і крывапралітнай вайне. І калі 22 чэрвеня 1941 года лічыцца трагічнай датай, то 9 мая 1945 года — радасны і вясёлы дзень. Акрамя таго, трэба ведаць і дату 3 ліпеня 1944 года. Менавіта ў гэты дзень быў вызвалены горад-герой Мінск.

**3. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС.** Яшчэ адна трагічная дата ў гісторыі беларускага народа — 26 красавіка 1986 года. Наступствы аварыі адчувальныя і сёння. У выніку гэтай катастрофы пацярпела значная частка тэрыторыі Беларусі. Такое больш не павінна паўтарыцца.

**4. Канец савецкай эпохі.** У 1991 годзе Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік спыніў сваё існаванне. Я рада, што мне давялося пажыць і ў савецкі час са сваімі законамі і парадкамі. А вось сённяшняе маладое пакаленне толькі з кніг можа даведацца пра тое, што хавалася за абрэвіятурай СССР. Гэтую дату трэба ведаць, бо менавіта тады Беларусь стала незалежнай дзяржавай.

**5. Выбары першага беларускага Прэзідэнта.** У 1994 годзе адбыліся выбары першага ў гісторыі незалежнай дзяржавы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Як вядома, ім стаў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, які і сёння працуе дзеля дабрабыту беларускага народа.

<u>Руслан ВАШКЕВІЧ, мастак:</u>

**1. УНОВІС. 1919 г.** Віцебск. Група мастакоў на чале з Казімірам Малевічам абвясціла сябе «**У**строителями **НОВ**ого **ИС**кусства». Гэта стала кропкай адліку ў найноўшай гісторыі мастацтваў.



**2. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС. 1986 г.** Трагедыя планетарнага маштабу. Як злачынства і пакаранне, як ахвяра, як пакаянне.

**3. «Лёгкі партызанскі рух». 1998 г. Мінск. Галерэя «Сёмы чарвяк».** Мастацкі праект Ігара Цішына. Партызанская тэма арыгінальна і дакладна раскрытая аўтарам як нацыянальная рыса беларускага характару, як прыкмета філасофіі мас.

**4. ВКЛ. Вялікае Княства Літоўскае.** Абрэвіятура «ВКЛ» як гузік уключэння, указанне на рабочы рэжым.

**5. Невядомая вайна 1654-1667.** Вайна рускага цара Аляксея Міхайлавіча з Рэччу Паспалітай. Захоп беларускіх земляў з далейшай гвалтоўнай русіфікацыяй...

<u>Алена ТУРАВА, кінарэжысёр:</u>

**1. Нараджэнне Ісуса Хрыста.** Трэба ведаць хоць бы таму, што большасць чалавецтва вядзе летазлічэнне ад гэтай даты.

**2. Айчынная вайна 1812 года.**

**3. Вялікая Айчынная вайна 1941 — 1945 гг.** Пераацаніць ролю беларускага народа ў гэтай вайне вельмі складана.



**4. Чарнобыльская катастрофа.** Навучанне для ўсіх, хто занадта ўпэўнены ў здольнасці чалавечых сіл кантраляваць сілы прыроды.

**5.1991 год: развал СССР.** За ўсю сваю гісторыю Беларусь упершыню стала суверэннай дзяржавай.

<u>Уладзімір ПУГАЧ, лідар гурта «J:морс»:</u>

Лічу, што немагчыма будаваць будучыню, не ведаючы свайго мінулага.



**1. 1410 г. Грунвальдская бітва.**

**2. 1519 г. Пераклад Бібліі Францыскам Скарынам на беларускую мову.**

**3. 1944 г. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

**4. 26.04.1986 г. Чарнобыльская трагедыя.**

**5. 25.08.1991 г. Дэкларацыя незалежнасці Беларусі.**

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# КРЫЖАВАНКА

*Да 90-годдзя з дня нараджэння Івана МЕЛЕЖА*

## Пісьменнік, грамадскі дзеяч, Грамадзянін

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*




**Па гарызанталі: 1.** « Мінскі ...». Раман народнага пісьменніка Беларусі, публіцыста, драматурга, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Івана Мележа, якому 8-га лютага споўнілася б 90 гадоў з дня нараджэння. **4.** «... ў шпіталі». Першае на беларускай мове апавяданне пісьменніка, якое ў 1944 годзе надрукавала газета «Звязда». **6.** ...не бяда, пастаяла ды й пайшла (прык.). **7.** «... Пашаны». Ордэн, адзін з многіх, якімі быў узнагароджаны І. Мележ. **9.** Рыса характару, якая была ўласцівая пісьменніку. **10.** «Прыгожа ... выводзіць ён пяром». З верша Максіма Багдановіча «Перапісчык». **12.** «Як жа вам чуецца ў свеце цяпер, \\ ... мае на палескім балоце?» З верша паэта Міколы Мятліцкага «Пудка шапоча на ветры аер», які ён прысвяціў памяці свайго земляка Івана Мележа. **13.** Тое, што і любіцель. **17.** «І ... шапчу ім аб шчасці, \\ І цемру зганяю з вачэй». З верша Янкі Купалы «Мароз». **18.** Тонкая празрыстая матэрыя. **21.** У адзенні не ..., у кажуху не касец (прык.). **22.** ... навальніцы». Раман з трылогіі І. Мележа «Палеская хроніка», за які пісьменнік атрымаў Ленінскую прэмію. **24.** Калі ... перад вольхай ліст распусціць, то лета будзе сухое (прык.). **27.** «... Палесся». Абласная газета, якая выдавалася некалі ў г. Мазыры і да вайны друкавала першыя вершы І. Мележа. **28.** Калі на Кірыла (прысвятак, адзначаўся 27-га лютага) ... — чакай яшчэ маразы (прык.). **29.** У лютым вострыя мароз — кароткая ...(прык.). **30.** ...,публіцыст. Літаратурныя прафесіі І. Мележа. **31.** Вёска на Хойнікшчыне, малая радзіма І. Мележа.

**Па вертыкалі: 1.** Драбяза, нешта дробнае. **2.** Жаночая асоба, якая прад'яўляе іск. **5.** Паказ чаго-небудзь. **6.** Імя аднаго з герояў рамана І. Мележа «Людзі на балоце». **8.** Назва палескай вёскі, у якой разгортваюцца падзеі рамана трылогіі «Людзі на балоце». **11.** Верш І. Мележа, які ў 1939 годзе быў надрукаваны ў газеце «Чырвоная Змена». **14.** «Пакуль вы ...». Назва п'есы І. Мележа (1956 г.). **15.** «Першая ...». Зборнік пісьменніка, у якім змяшчаюцца дзённікі, запісы ваенных гадоў. (1977 г.). **16.** « ..., снежань». Трэці з раманаў трылогіі «Палескія хронікі», які застаўся незавершаным. **19.** Часопіс, у якім працаваў І. Мележ. **20.** ... Чорны. Беларускі пісьменнік, які высока ацаніў адно з ранніх апавяданняў І. Мележа « У завіруху». **23.** Драўляныя пласціны, якія ў старажытнай Беларусі выкарыстоўваліся як вокладкі для кніг, сшыткаў. **25.** Мастацкая, пераважна вершаваная творчасць. **26.** Імя жонкі І. Мележа.

**АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ:**
**Па гарызанталі: 1. Напрамак. 4. Сустрэча. 6. Вада. 7. Знак. 9. Сціпласць. 10. Літары. 12. Людзі. 13. Аматар. 17. Казкі. 18. Вуаль. 21. Плавец. 22. Подых. 24. Бяроза. 27. Бальшавік. 28. Ясна. 29. Зіма. 30. Нарысіст. 31. Глінішча. Па вертыкалі: 1. Смецце. 2. Ісціца. 5. Агляд. 6. Васіль. 8. Курані. 11. «Радзіме». 14. Маладыя. 15. Кніга. 16. Завеі. 19. «Полымя». 20. Кузьма. 23. Дошкі. 25. Паэзія. 26. Лідзія.**

## Усміхнемся



П'яны муж прыходзіць у 3 гадзіны ночы дахаты. Жонка пачынае яго біць па галаве патэльняй, прыгаворваючы:

— Вось табе гадзіна, вось табе дзве, вось табе тры...

Муж, з палёгкай:

— Добра, што ў 12 не прыйшоў...

☺

**Кранаўшчык з пятнаццацігадовым стажам за пяць хвілін абчысціў аўтамат з мяккімі цацкамі.**

☺

Дзве сяброўкі:

— Ты бачыла Веру? Як яна стала дрэнна выглядаць, небарака!

— Так, паглядзець прыемна...

☺

**Тыя, хто кажуць, што ўначы есці нельга, хай паспрабуюць патлумачыць, для чаго прыдумана святло ў халадзільніку.**

☺

— Доктар, скажыце, у мяне грып?

— Так, свіны!

— Чаму?!

— Толькі свіння магла выклікаць «хуткую» ў 4 раніцы з тэмпературай 36,9!

☺

**Жаночая народная забава: сама прыдумала, сама пакрыўдзілася.**

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### ЧЭМПІЁН КРАІНЫ



Па шашачнай кампазіцыі ў раздзеле задач-100 чэмпіёнам стаў Мікалай Баброўнік з Мазыра. Ён набраў 32,5 ачка. Сярэбраны медаль заваяваў нацыянальны майстар Анатоль Шабалін з Мінска (24,5), бронзавы — кандыдат у майстры спорту Мікалай Крышталь з Пінска (22,75). Абслугоўвалі спаборніцтва арбітры М. Фёдараў, У. Рычка з Украіны, А. Разанка з Мінска і суддзя-каардынатар В. Грабенка (таксама мінчанін).

Адна з лепшых задач чэмпіёна атрымала выдатную ацэнку — 8,75 ачка.

Разгледзьце яе ў якасці нашага **бліца-61/1**:



**Белыя:** 8, 11, 13, 21, 22, 24, 34, 41, дамкі 1, 7, 14, 15, 26, 29, 47 (15). **Чорныя:** 2, 25, 36, 43 (4).

Замкнуць дамку чорных: 48 (49А) 1-6, 7-12, 48-37, 47-38, 14, 9, 34:25#. Варыянт жа А(30) застаецца за вамі.

М. Баброўнік адзначае, што яму дапамаглі стаць шашачным кампазітарам М. Пустыннікаў, Г. Далідовіч, А. Ракітніцкі, Л. Вітошкін, М. Грушэўскі і іншыя спецыялісты і прапагандысты старадаўняй гульні.

### АЎТАРСКІЯ КОНКУРСЫ

Іх працягваюць гросмайстар СССР з Гомеля Леанід Вітошкін і міжнародны майстар з Мінска Віктар Шульга: першы — трынаццаты па ліку, другі — чатырнаццаты:



№ 13/15. **Белыя:** a1, b6, c7, e5, e7, f6, g5, h2 (8). **Чорныя:** a3, a5, b2, c3, d4, f2, h4, h6, h8 (9). Выйгрыш.

№ 14/9. **Белыя:** 8, 11, 13, 22, 24, 27, 30, 31 (8). **Чорныя:** 6, 14, 15, 19, 23, 35, 36, 42 ( 8). Перавага белых пры іх першым ходзе.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

**Аўтарскія:** Л. Вітошкіна — **13/9.** c7 (d6) b6, f8, g3, c7, g5x, **13/10.** d8, b2, d2, e7, h4 (e3) e1 (d2) g3, a3x, В. Шульгі — **14/3**. 9, 3, 21, **І** 11!! (6:17**АВ**) 12, 43x. **А** (26:17) 26, 43x. **В** (8) 48!, 43 (22) 16 (39**С**) 11x. **С**(28) 43x. **І** 17-12, 43 (11) =. У другім чэмпіянаце Пінска 2009 года ацэнена ў 7,5 ачка і **14/4.** 43 (45:23**А**) 1, 45, 31, 27, 36x. **А**(25:23) 1 (49) 38 (43**В**) 13, 35, 44x. **В**(34) 40, 35, 41/46x. Легальнасць зыходнай пазіцыі даказваецца: (15-20) 34-29 (20:27).

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.03 | 18.29 | 12.26 |
| Віцебск — | 5.53 | 18.20 | 12.27 |
| Магілёў — | 5.54 | 18.19 | 12.25 |
| Гомель — | 5.51 | 18.15 | 12.24 |
| Гродна — | 6.18 | 18.45 | 12.27 |
| Брэст — | 6.20 | 18.44 | 12.24 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 26 сакавіка. Месяц у сузор'і Стральца.*

**Імяніны**

***Пр.** Сафрона, Яфіма.*

***К.** Катарыны, Габрыеля, Марка, Шымана.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 24 сакавіка

**Дзве даты**

**1794 год** — пачалося вызваленчае паўстанне ў Рэчы Паспалітай пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Яно працягвалася да 16 лістапада 1794 года.



**1531 год** — нарадзіўся Васіль Мікалаевіч Цяпінскі, славуты беларускі гуманіст-асветнік, кнігавыдавец, пісьменнік, перакладчык. Быў сучаснікам і аднадумцам Сымона Буднага, прадаўжальнікам гуманістычных і культурна-асветніцкіх традыцый Францыска Скарыны. Паводле некаторых звестак, у сваім радавым маёнтку Цяпіна (зараз Чашніцкі раён) стварыў друкарню, дзе выдаў «Евангелле» паралельна на царкоўна-славянскай і старабеларускай мовах. Выданне ўпрыгожана ініцыяламі, наборным арнаментам, шрыфт стылізаваны пад шрыфты кніг Ф. Скарыны і С. Буднага, што сведчыць аб пераемнасці друкарска-выдавецкіх традыцый. Прадмова да яго — адзін з найлепшых узораў беларускай патрыятычнай публіцыстыкі XVI стагоддзя. Тут Цяпінскі выступіў у абарону беларускага народа і яго традыцый, за развіццё адукацыі і кнігадрукавання на беларускай мове. Дзейнасць Васіля Цяпінскага спрыяла зараджэнню, уздыму і кансалідацыі шырокага нацыянальна-культурнага і патрыятычнага руху ў Беларусі ў канцы XVI — пачатку XVII стагоддзя. Памёр каля 1600 года.

**Цытата дня:**

*«Кожнае дзіця — мастак. Цяжкасць у тым, каб застацца мастаком і выйшаўшы з дзіцячага ўзросту».*

**Пабла Пікасо (1871—1973), французскі жывапісец.**

Шчыра віншуем **з 50-годдзем Віктара ШЛЫКА** з г. Зэльвы. Жадаем здароўя, шчасця, удачы, Божай ласкі.

**Сем'і Шлыкаў з Мінска і Карэлічаў.**

Паважаны **Аляксей Андрэевіч НОВІК**, былы дырэктар і настаўнік Сяражскай СШ, ветэран ВАВ і працы! Прыміце нашы сардэчныя віншаванні з нагоды **90-годдзя з дня нараджэння!** Зычым Вам, чалавеку вялікай душы і сэрца, здароўя ў адпаведнасці з узростам, бадзёрасці, жыццёвага аптымізму. Заставайцеся і надалей такім добрым і шчырым, якім мы Вас ведаем.

**Ад імя былых вучняў Аганоўскі В.М., настаўнікі Некрашэвіч, Ярота, Новік, Біран, Гурыновіч.**



Фота Пятра ФАМІНА.

<u>Віктар ГАНЧАРЭНКА:</u>

# «ШКАДА, ШТО НЕ АКАЗАЛІСЯ НА МЕСЦЫ ПСЖ. МАГЛІ Б НАРМАЛЬНА ЗГУЛЯЦЬ СУПРАЦЬ «БЕНФІКІ»

**ГЭТА футбольнае міжсезонне было азнаменавана шэрагам гучных кантрактаў, праўда, галоўным ньюсмейкерам на трансферным рынку стаў зусім не чэмпіён краіны. Сёлета ў барацьбе за таленты і імёны супернічалі ў асноўным мінскае «Дынама» і салігорскі «Шахцёр». У сталічным клубе, калі меркаваць па прозвішчах, сабралася выдатная каманда: вярнуліся Леанід Ковель і Бруна Мбанангой, прыйшлі Слава Глеб і Рафаэль Ледэсма, застаўся Стас Драгун... Нядрэнная заяўка на чэмпіёнства. І чым адкажа БАТЭ, які пасля лютаўскіх матчаў з ПСЖ панёс страты ў выглядзе траўмаваных Аляксандра Юрэвіча і Віталя Радзівонава? За тыдзень да старту XXI чэмпіянату краіны галоўны трэнер барысаўскай каманды Віктар Ганчарэнка падзяліўся навінамі пра стан клуба, а таксама расказаў, што думае пра супернікаў, у прыватнасці, пра сталічнае «Дынама», і пашкадаваў, што БАТЭ не аказалася на месцы ПСЖ.**

— Міжсезонне ў нас атрымалася не такім, як раней. Давялося экспрэс-шляхам рыхтавацца да матчаў з ПСЖ. Мы не фарсіравалі. Лічу, што добра падрыхтаваліся да гульняў Лігі Еўропы. І ўбачылі, што нам па сілах дэманстраваць добры футбол нават у лютым. Але гульнявога тонусу нам усё ж не хапала, гэта будзе навукай на будучае.

***— Што думаеце пра супернікаў напярэдадні старту нацыянальнага чэмпіянату?***

— Расклад атрымліваецца даволі цікавым. Добрую селекцыю правяло сталічнае «Дынама», «Шахцёр» захаваў мінулагодні склад, і нават палепшыў яго, нядрэнна ўмацаваўся «Мінск»... Перад кожным сезонам даводзіцца чуць, што ён атрымаецца самым цікавым і непрадказальным. Напэўна, сёлета, як і заўсёды, будуць каманды, якія выстраляць. Будуць, трэба меркаваць, і такія, якія расчаруюць. Але, каб перамагаць, трэба выступаць стабільна, і гэта тычыцца найперш нас.

***— Чакаеце супрацьстаяння з мінскім «Дынама», якое зараз сур'ёзна ўмацавалася?***

— Мы найперш думаем, як узмацніць сваю гульню. Зразумела, збіраем інфармацыю пра ўсіх супернікаў, але загадзя параўноўваць каманды не хачу. Наша задача зрабіць БАТЭ яшчэ мацней. На мой погляд, наша каманда прасунулася на паўкрок наперад, і гэта для нас галоўнае. Я, дарэчы, пазнаёміўся з цяперашнім галоўным трэнерам «Дынама» яшчэ летась, на турніры ў Сочы. Мы паразмаўлялі з Алегам пасля нашай гульні з «Жамчужынай». Ён пакінуў уражанне спакойнага, ураўнаважанага маладога чалавека. Дамаўляліся, што дзе-небудзь яшчэ сустрэнемся...

***— БАТЭ мог выступіць больш удала і ў матчах з ПСЖ, і нават на наступнай стадыі Лігі Еўропы...***

— Калі ішла трансляцыя матча «Бенфіка» — ПСЖ, у мяне ўзнікла шкадаванне, што мы не аказаліся на месцы парыжан. Улічваючы апошнія кадравыя страты лісабонскага клуба, футбалісты якога зараз выступаюць і ў «Рэале», і ў «Чэлсі», мы б маглі ў той сітуацыі нармальна згуляць і супраць «Бенфікі». Але сваім шанцам мы не скарысталіся. Затое набылі вялізны вопыт, які нам яшчэ дапаможа.

***— Ці не рана ваша каманда набрала форму?***

— Гэта пытанне рытарычнае. Шмат будзе залежаць ад якасці палёў. У нядзелю я ездзіў у Гродна на кубкавы матч «Нёмана» і «Белшыны». Мне спадабаўся стан газону ў Гродне. Калі ўсе палі будуць такімі, мы прадэманструем якасны футбол.

***— Вынікі паўфінальных кубкавых матчаў вас не здзівілі?***

— Не. Нават перамога «Гомеля» над «Шахцёрам». Кубкавыя матчы прывабныя тым, што не заўсёды перамагае больш моцны супернік. Часцей перамагае тая каманда, якая найлепш матываваная, якая лепш гатовая зараз. Таму прадказаць вынік кубкавага паядынку складана.

***— Галоўны трэнер нацыянальнай каманды крытыкаваў нядаўна стан некаторых футбалістаў. Ахарактарызуйце форму, у якой знаходзяцца футбалісты БАТЭ, якіх выклікалі ў зборную.***

— На трэніроўцы траўму атрымаў Максім Бардачоў. Пакуль невядома, наколькі сур'ёзную. Як вядома, траўмаваныя Аляксандр Юрэвіч і Віталь Радзівонаў. Што тычыцца Ігара Шытава і Паўла Няхайчыка, то яны знаходзяцца ў вельмі добрай форме. Нават трохдзённая хвароба падчас турэцкага збору не выбіла з каляіны Няхайчыка.

***— Каго з футбалістаў ў гэта міжсезонне БАТЭ так і не змог атрымаць?***

— Не сакрэт, што мы хацелі бачыць у сваім складзе Стаса Драгуна. І хоць у нас гэта не атрымалася, я задаволены селекцыяй. У мінулым сезоне ў нас была нядрэнная лаўка запасных, зараз мы яе ўзмацнілі. У нас кожная пазіцыя дубліруецца, ва ўсіх хлопцах я ўпэўнены. Праблемных пазіцый у нас няма. У мяне яшчэ больш праблем будзе з вызначэннем 18 гульцоў, якія трапяць у заяўку, ужо не кажучы пра стартавы склад.

***— Якая сітуацыя ў БАТЭ з нападаючымі пасля траўмы Радзівонава?***

— Мы разлічваем і на бразільца Алекса. Праўда, у яго яшчэ шмат слабых месцаў, якія трэба ліквідаваць. Не трэба забываць і пра Скавыша, які адчувае сябе выдатна ва ўмовах адсутнасці канкурэнцыі. Калі не было Радзівонава і Канцавога, Максім відавочна прыбаўляў. Я не раз яму казаў, што трэба быць лепшым на кожнай трэніроўцы, не баяцца канкурэнцыі, тады з яго атрымаецца класны нападаючы. Нарэшце вярнуўся ў строй Канцавы. У нас тры кваліфікаваныя нападаючыя — ёсць з каго выбіраць.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 1385. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12